

«ДОКТАР ХАУСС»: КОРАТКА І СМЕШНА

ЧЫРВОНКА

СТУДАТРАДЫ — БРЭНД МАЛАДЗЁЖНАЙ ПАЛІТЫКІ




ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 СТУДЗЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 6 (29886)

## ЛІЧБА ДНЯ

**184,3 млн кубічных метраў**

*спадарожнага нафтавага газу было здабыта ў краіне ў 2022 годзе, што вышэй за планавы паказчык на 3,3 млн куб. м. Спадарожны нафтавы газ накіроўваецца на Беларускі газаперапрацоўчы завод, які спецыялізуецца таксама на вытворчасці аўтамабільнага прапану-бутану. Цяпер БГПЗ поўнасцю пакрывае патрэбнасць даччыных прадпрыемстваў кампаніі па забеспячэнні нафтапрадуктамі ў звадкаваным аўтамабільным газе з сыравіны беларускіх радовішчаў. Попыт, які сёння пастаянна расце на гэты даступны экалагічны від аўтапаліва, задавальняецца ў поўным аб'ёме.*



## КОРАТКА

- «АМКАДОР» у мінулым годзе нарасціў экспарт больш як на 80 працэнтаў.
- **Беларусь і Расія падпісалі план супрацоўніцтва ў сферы адукацыі.**
- Рэзідэнты СЭЗ «Мінск» у 2022 годзе прыцягнулі ў 1,7 раза больш прамых замежных інвестыцый.
- **Зенітныя ракетныя падраздзяленні Беларусі і Расіі заступілі на баявое дзяжурства.**
- Мінінфарм аб'яўляе прыём заявак на літаратурны стартап LitUP.
- **Мінбудархітэктуры аб'явіла аб заснаванні двух штогадовых конкурсаў.**

ISSN 1990 — 763X

# Сталоўка на «Белай сцежцы»



Фота БелТА.

**Егеры паляўнічай гаспадаркі «Белая сцежка», што ў Мастоўскім раёне (адзін з іх — Уладзімір БЫКАЎ, на гэтым фота), дапамагаюць дзікім жывёлам перанесці цяжкасці зімы, арганізоўваючы для іх спецыяльныя сталовыя. Для аленяў і казуль у спецыяльна пабудаваныя кармушкі закладваецца сена. Акрамя гэтага, у кожны падкормачны стол штодзень насыпаюць па 50 кілаграмаў збожжа.**

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

## ЧАС МАЛАДЫХ У КРАІНЕ МАГЧЫМАСЦЯЎ

**Беларусь — краіна магчымасцяў. Для маладых людзей, без перабольшання, тут адкрытыя ўсе дарогі. Былі б толькі настойлівасць, здольнасці, жаданне вучыцца і працаваць — і рэалізаваць сябе абавязкова атрымаецца. А дзяржава дапаможа.**

Сёння час вельмі няпросты і надзвычай цікавы. Акрамя праблем, якія патрабуюць яднання ўсяго грамадства, у нашай незалежнай краіне адбываецца яшчэ адна важная з'ява — змена пакаленняў. Ва ўсіх сферах — на вытворчасці, у кіраванні, у палітыцы. Прыходзяць маладыя амбіцыйныя людзі, розныя па характары і кампетэнцыях. Але іх аб'ядноўвае адна мэта — росквіт роднай краіны.

Менавіта пра іх — маладых, амбіцыйных, патрыятычна настроеных — мы і будзем расказваць у праекце «Плеяда маладых», які невыпадкова пачынаем менавіта ў Год міру і стварэння. У кожным нумары «Чырвонкі. Чырвонай змены» на працягу года чытачы будуць знаёміцца з новым героем. А на хвалях радыё «Пілот-FM», з якім мы супрацоўнічаем у гэтым праекце, можна будзе пачуць аўдыяверсію.

*У сённяшнім нумары «Чырвонкі» — першы герой з «Плеяды маладых».*

ЧЫРВОНКА




Фота Лізаветы ГОЛАД.

Знаёмімся з лаўрэатамі

### Дзмітрый ШАЎЦОЎ:

## «КАЛІ ЧАЛАВЕК АДНОЙЧЫ ЗРАБІЎ ДОБРУЮ СПРАВУ, ЁН НЕ ЗАСТАНЕЦЦА РАЎНАДУШНЫМ І НАДАЛЕЙ»



**Беларускі Чырвоны Крыж дапамагае людзям, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі па ўсёй тэрыторыі Беларусі, яго прадстаўніцтвы маюцца ў кожным раёне краіны. Пажылыя людзі, інваліды, дзеці, якія засталіся без бацькоў ці маюць цяжкія захворванні, мігранты, людзі, што вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі, — штогод атрымальнікамі дапамогі становяцца сотні тысяч чалавек. Пры гэтым у Беларускім Чырвоным Крыжы ўсяго 420 супрацоўнікаў, а за вялікай часткай добрых спраў стаіць работа яго валанцёраў. Беларускі Чырвоны Крыж аб'яднаў каля 16 тысяч такіх людзей.**

**Развіццё валанцёрскага руху, дабрачынная дапамога, гуманітарныя праекты — у краіне, бадай, няма арганізацыі, якая дзейнічае па названых кірунках больш маштабна. Сёлета Беларускі Чырвоны Крыж адзначаны прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне». Мы пагутарылі з генеральным сакратаром арганізацыі Дзмітрыем ШАЎЦОВЫМ.**

СТАР. 4

Блізкая ўлада

# НЕВЫРАШАЛЬНЫХ ПЫТАННЯЎ НЕ БЫВАЕ

**Члены Савета Рэспублікі правялі адзіны дзень прыёму грамадзян у Мінску. З чым прыходзілі людзі да Наталлі Качанавай**

**Не засталіся па-за ўвагай парламентарыяў жыхары ўсіх тэрытарыяльных падраздзяленняў сталіцы. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА выслухала людзей у Адміністрацыі Першамайскага раёна. Да яе традыцыйна запісалася найбольшая колькасць заяўнікаў — звыш ста чалавек.**
**Прыняць за дзень усіх ахвотных па аб'ектыўных прычынах было немагчыма. Сваю ўвагу спікер верхняй палаты парламента ўдзяліла некалькім дзясяткам заяўнікаў. Усе былі выслуханы, адпаведныя даручэнні дадзены.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

### «ЗРАБІЦЕ ЎСЁ, ШТО МОЖНА»

Пытанні, з якімі жыхары сталіцы і не толькі звярталіся да Наталлі Качанавай, былі самыя розныя. Традыцыйна найчасцей людзі сутыкаюцца з праблемамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У прыватнасці, мінчанка Наталля Купрэвіч паскардзілася Старшыні Савета Рэспублікі на капітальны рамонт у жылым доме, які доўжыцца з 2015 года. Па словах жанчыны, шматпавярховік быў пабудаваны ў 1958 годзе, але рамантаваць яго ўзяліся толькі сем гадоў таму — да гэтага капрамонт неадпойчы пераносіўся.



«Давялі дом да такога стану, што балконы развальваюцца, дах цячэ, — паведаміла Наталля Купрэвіч. — У выніку для правядзення капітальнага рамонту, які два разы адкладвалі, спатрэбілася вялікая сума. Грошы, што выдзелілі, не змаглі забяспечыць якасны рамонт. Да моманту здачы дома многае не было зроблена».

Пры гэтым у працэсе эксплуатацыі выявіліся праблемы, якіх раней не было. Напрыклад, прыйшоў у дрэнны стан ганак — там цяпер пастаянна цячэ вада. Ужо былі выпадкі, калі людзі падалі. Мясцовыя ўлады, па словах заяўніцы, рэагаваць на гэтыя пытанні не хочуць, таму яна вымушана была звярнуцца да спікера верхняй палаты парламента.

Як заўважыў старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў, які прысутнічаў на прыёме грамадзян, сітуацыя неадназначная. Справа ў тым, што не ўсе жыхары гэтага жылога дома пагадзіліся мяняць сістэму ацяплення — у выніку скардзяцца цяпер то на нізкі, то на высокі тэмпературны рэжым у памяшканнях. Пры гэтым Уладзімір Кухараў паведаміў, што, як толькі ўсталюецца прыдатнае надвор'е, ганак будзе адрамантаваны. Па яго словах, ужо пастаўлены канкрэтныя задачы.

Як высветлілася, жыхары шматкватэрнага дома ўжо неаднаразова былі на прыёме ў органах гарадской улады, аднак канкрэтныя рашэнні па іх праблеме прагучалі толькі падчас прыёму ў Наталлі Качанавай. «Тут зразумела адно — гэта халатнасць і абыякавыя адносіны да людзей, чаго быць не павінна, — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі і паабяцала ўзяць пытанне на кантроль. — Трэба прайсціся па кватэрах і спытаць у людзей, ці патрэбна ім новая сістэма ацяплення. Няма скаргаў — пытанне закрыта».

Наталля Качанава заўважыла, што ўсюды, дзе б яна ні была, звяртаюцца з падобнымі пытаннямі, якія павінны вырашаць мясцовыя органы ўлады. «Людзі задаюць правамерныя пытанні, — звярнула ўвагу яна. — Абмяркуйце ўсе варыянты і зрабіце ўсё, што можна зрабіць».

Як расказала пасля прыёму заяўніца, яна задаволена, што яе пачулі на такім высокім узроўні. «Пасля кожнага прыёму ў іншых службовых асоб у нас былі спадзяванні, што нам дапамогуць, але, на жаль, ні адно не спраўдзілася, — падзялілася Наталля Юр'еўна. — Наталля Іванаўна мяне ўважліва выслухала. Пытанні, якія яна мне задавала, былі па справе. Было відаць, што яна зацікаўлена ў вырашэнні маёй праблемы. Адказным асобам былі дадзены адпаведныя даручэнні».

### КЛУБУ — БЫЦЬ!

На прыём людзі прыходзілі як з асабістымі пытаннямі-праблемамі, так і калектыўнымі. У прыватнасці, Людміла Аляксеева і Аксана Азарава прыехалі ў Мінск з Аршанскага раёна з калектыўным зваротам ад 200 жыхароў вёскі Антонаўка. Жанчыны паскардзіліся, што мясцовы клуб, які ахопліваў насельніцтва пяці найбліжэйшых вёсак, зачынілі. Калектыў перасялілі ў два пакоі на базе аздараўленчага комплексу, у той час як будынак клуба плошчай у амаль 400 квадратных метраў пустуе.

«Мясцовыя ўлады нам патлумачылі, што ўтрымліваць клуб нерэнтабельна, — гавораць жанчыны. — А ніхто не падумаў пра дзіцячы і дарослы калектывы, якія ў нас ёсць. Дзе ім рэпеціраваць, дзе выступаць? Між іншым, наш фальклорны калектыў з'яўляецца адзіным у раёне, якому 30 гадоў. Нашы калектывы выступаюць і на «Дажынках», і на «Славянскім базары», а нам няма дзе займацца».

Наталля Качанава ўважліва выслухала жанчын і патрабавала, каб адказныя асобы разабраліся ў сітуацыі. Пазбаўляць даху над галавой творчыя калектывы катэгарычна нельга — такая пазіцыя спікера верхняй палаты парламента.

### НА АСАБІСТЫМ КАНТРОЛІ

Марына Канапацкая прыехала на прыём грамадзян са Слуцка. І не адна. Жанчыну суправаджалі муж і грудное дзіця — Патапу нядаўна споўнілся год і два месяцы. Дома браціка і бацькоў чакалі яшчэ чацвёра дзяцей. Дык што ж прымусіла шматдзетную маці пакінуць іх на выхаванне нянькі і сваёй ужо пажылой маці, каб пераадолець некалькі дзясяткаў кіламетраў на руках з немаўляткам?



Як высветлілася, Марыне Канапацкай «пашанцавала» з суседзямі. Сусед наўмысна — аб гэтым сведчаць камеры відэаназірання — пабіў сваім аўтамабілем яе машыну. Прычым неаднойчы! Заяўніца некалькі разоў звярталася ў праваахоўныя органы: у выніку шэсць разоў на правапарушальніка заводзілася крымінальная справа і столькі ж закрывалася. «Усё гэта тлумачылася адсутнасцю саставу злачынства, — адзначае шматдзетная маці. — Звярталася я ў пракуратуру, аднак пытанне ўсё роўна не вырашаецца, хоць ёсць і відэазапісы, і паказанні сведкаў».

Наталля Качанава ўважліва выслухала заяўніцу і здзівілася, чаму да гэтага часу чалавек, які яўна парушае закон, не панёс пакарання. Намеснік пракурора Мінскай вобласці Міхаіл Шастапалаў паабяцаў асабіста азнаёміцца са справай і, калі на тое будуць падставы, прыцягне нядобрасумленнага грамадзяніна да адказнасці. Старшыня Савета Рэспублікі, у сваю чаргу, паабяцала трымаць гэтае пытанне на асабістым кантролі, адзначыла, што ўвядзе ў курс міністра ўнутраных спраў.

«Мне вельмі прыемна, што Наталля Іванаўна не абышла маю праблему сваёй увагай, — падзялілася пасля прыёму Марына Канапацкая. — Я на працягу 30 гадоў жыву ў гэтым доме, і такога суседа, які б так паводзіў сябе, у нас яшчэ не было. Прычым ён не толькі нашай сям'і прыносіць шкоду — ад яго церпяць многія жыхары. А яму гэта ўсё роўна: заплаціў штраф — і далей парушае заканадаўства, нормы маралі».

Усе, хто трапіў на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі, перакананы, што іх праблемы вырашацца. Іначай і не можа быць. Кожнага выслухаўшы, Наталля Качанава або адразу дала адпаведныя даручэнні, або папрасіла больш часу, каб дасканала разабрацца. У любым выпадку, аб выніках чалавек будзе праінфармаваны.

**Вераніка КАНЮТА.**

*З якімі яшчэ пытаннямі людзі звярталіся да Наталлі Качанавай і да іншых сенатараў, падрабязней чытайце ў найбліжэйшым выпуску «Мясцовага самакіравання».*

Па сутнасці



# Святло над роднай хатай

Раство Хрыстова — гэта заўжды мір і стварэнне. Хаця б у душы. Ну хаця б імкненне да гэтага стану. Каб унутры і тое ж — навокал. Але святы завяршаюцца, а мір і стваральная праца ў Беларусі застануцца. Мы так марым, мы так хочам. Гэта памкненне кожнага беларуса. І калі мы ўсе сабраліся за навагоднім сталом, то пачулі галоўныя словы: 2023-і будзе ў Беларусі Годам міру і стварэння.

Дарэчы, першая нарада года ў Палацы Незалежнасці якраз і была прысвечана стварэнню. А дакладней — будаўніцтву. Прабачце, але кіраўнікі якіх дзяржаў так пільна сочаць за будаўніцтвам? Асабліва для шматдзетных. На ўмоўна багатым Захадзе мацярынства і дзяцінства не падтрымліваюць. Наадварот. Зрабілі архаікай, ганебным заняткам. Пакуль «батарэі просяць цяпла» ў кватэрах у Паўднёвым Кенсінгтане альбо ў Вільмерсдорфе, палітыкі змагаюцца за правы агідных нораваў ці падпісваюць браню тэхнікі перад адпраўкай ва ўкраінскую бойку. Вось чаму так неабходныя свету, асабліва Еўропе, мір і стварэнне.

Не, яшчэ не ўся ваенная тэхніка з еўрапейскіх ангараў утылізавана вайной. Яшчэ не ўсе жыхары джунгляў пахаваны пад сваімі сцягамі пад жудасныя крыкі. Вось калі застануцца толькі тыя, хто неабходны для аплаты крэдытаў за «джавеліны» і «байрактары», тады крывавыя спонсары спыняць лэнд-ліз сучаснасці. А вось яшчэ адзін варыянт: зачысціць жыццёвую прастору ад аўтахтоннага насельніцтва. У сталіцах прыняцця рашэнняў і выдумваць нічога не трэба. Так ужо неаднаразова яны рабілі на нашых — славянскіх — землях. Таму мір і стварэнне — гэта не пра некалі ўзорны Захад. Мір і стварэнне — сапраўдныя каштоўнасці, гэта не грошы, якія можна надрукаваць. Мір і стварэнне — гэта не лічбавыя куміры, якія можна запраграмаваць бяздушнымі алгарытмамі. Мір і стварэнне — плён стараннаў ЧАЛАВЕКА. Яго розуму і рук, намаганняў і жадання. А яшчэ абавязкова агульнай супольнасці.

Трэба быць неразвітым маральна, каб не заўважыць, што ў нашай краіне мір і стварэнне не дэкларуюць — гэта наша рэчаіснасць. І ўсім вядома і зразумела дзякуючы каму. Чаму адна хата на адной і той жа вуліцы выглядае прыгожа, а другая — недагледжана? Чаму ў адной краіне на Раство Хрыстова віншуюць дзяцей, саграваюць душэўнай цеплынёй старых, а ў суседняй — геапалітычная прорва, адкрыўся апакаліптычны партал? Усё залежыць ад гаспадара.

Вось з такіх, раней здавалася, нецікавых на дзяржаўным узроўні пытанняў, як сяўба, імпартазамяшчэнне, дыверсіфікацыя і пачынаецца мір і стварэнне. Усё залежыць ад сейбіта. Спытайце ў старэйшых: якая ўрадлівая ні была б глеба, шмат залежыць ад рукі, што сее зярняты.

У афіцыйных крыніцах адзначана, што «ў мэтах кансалідацыі беларускага народа, умацавання ў грамадстве ідэй міру і стваральнай працы як галоўных умоў развіцця беларускай дзяржавы» менавіта і вырашылі гэты год прысвяціць міру і стварэнню. Гэта ж так блізка да нашага нацыянальнага характару, да сэнсу дзяржаўных сімвалаў, гэтыя ідэалагемы ўплецены нават у старадаўнія ўзоры беларускіх рамёстваў. Беларусы ніколі не спявалі пра «яшчэ не згінэла» альбо «шчэ не ўмерла». Мы ніколі не спявалі і не чакалі пагібелі. Ні сваёй, ні для суседзяў. Наш Ясь заўжды выбірае Яніну — працавітую дзяўчыну. Мы — нацыя жыцця. Так і жыць трэба — праз мір і стварэнне. Вось менавіта гэтыя пастулаты мы можам пазычыць свету. Калі ў іх палітыкаў такія ж мэты, як у нашага Прэзідэнта, то паслухаюць. Мір і стварэнне патрабуюць плённай штодзённай працы. Асабліва калі навокал — геапалітычная слота.

Нам варта зберагчы сонечнае святло над нашай роднай хатай. На зямлі міру і стварэння.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

Май на ўвазе

# «КВАТЭРЫ НА СУТКІ» ПЕРАХОДЗЯЦЬ НА АДЗІНЫ ПАДАТАК

**Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія здаюць сваю маёмасць у кароткатэрміновую арэнду, сёлета абавязаны падаць у інспекцыю дэкларацыю да пачатку лютага.**

Як паведамілі рэдакцыі ў падатковай інспекцыі па горадзе Мінску, у сувязі са зменамі, унесенымі ў Падатковы кодэкс краіны, з 1 студзеня 2023 года індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць дзейнасць па вызяленні месцаў для кароткатэрміновага пражывання, абавязаны прымяняць адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб без права пераходу на іншы рэжым падаткаабкладання ў дачыненні да гэтай дзейнасці.

Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія здаюць (будуць здаваць) жыллё ў першым квартале 2023 года, абавязаны ў тэрмін не пазней за 31 студзеня 2023 года прадставіць у падатковы орган падатковую дэкларацыю (разлік) па адзіным падатку за першы квартал 2023 года і зрабіць выплату адзінага падатку ў наступныя тэрміны: за студзень 2023-га — у тэрмін не пазней за 1 лютага па «старых» стаўках; за люты і сакавік — у тэрміны, адпаведна, не пазней за 1 лютага і 1 сакавіка па «новых» стаўках гэтага года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Беларусь інтэлектуальная

# ВАКЦЫНЫ І ЗВЫШГУКАВЫЯ ЛЯТАЛЬНЫЯ АПАРАТЫ...

**Вызначаны ТОП-10 вынікаў дзейнасці вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў за 2022 год.**

Конкурс праводзіцца ў мэтах заахвочвання даследчыкаў і стымулявання творчай актыўнасці акадэмічных вучоных. Вынікі навуковай дзейнасці прадастаўляюцца на конкурс, калі яны адпавядаюць шэрагу крытэрыяў. Так, вынік мусіць быць апублікаваны ў выданні, якое мае высокі імпакт-фактар. Публікацыя павінна быць уключана ў міжнародныя базы даных. Атрыманая прынцыпова новая навуковая інфармацыя была ўпершыню апублікавана ў выглядзе кніжнага выдання (главы ў манаграфіі) і мае важнае значэнне для прагрэсу айчыннай і сусветнай навукі.

Сярод пераможцаў конкурсу за 2022 год — як персаналіі, так і аўтарскія калектывы.

Так, пераможцам конкурсу стаў загадчык цэнтра «Нанафатоніка» Інстытута фізікі імя Б. І. Сцяпанава НАН кандыдат фізіка-матэматычных навук Дзяніс НАВІЦКІ — за распрацоўку тэорыі ўзбуджэння рэзанансаў у асіметрычных актыўных фатонных структурах і яе прымяненне да розных тыпаў метаматэрыялаў.

Дырэктар ААТ «Мінскі НДІ радыёматэрыялаў» Юрый КЕРНАСОЎСКІ і начальнік сектара распрацоўкі сістэм — галоўны канструктар канструктарскага аддзела прадпрыемства Аляксей МАСПАНАЎ перамаглі з распрацоўкай сістэмы магнітна-зондавага кантролю дэфектнасці сталёвага пракату.

Загадчык лабараторыі Інстытута біяарганічнай хіміі НАН Беларусі, акадэмік, доктар хімічных навук, прафесар Уладзімір ХРЫПАЧ і галоўны навуковы супрацоўнік гэтага інстытута, член-карэспандэнт, доктар хімічных навук, дацэнт Уладзімір ЖАБІНСКІ трапілі ў ТОП-10 з распрацоўкай высокаэфектыўных антытаксічных проціпухлінных прэпаратаў новага пакалення на аснове прыродных стэроідаў.

Загадчык лабараторыі Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук, дацэнт Святлана ПАШКЕВІЧ была адзначана за абгрунтаванне эфектыўнасці пазаклеткавых везікулаў мезенхімальных ствалавых клетак для аднаўлення нервовых тканак.

У ліку найлепшых таксама аўтарскі калектыў Інстытута цепла- і масаабмену імя А. В. Лыкава НАН Беларусі з распрацоўкай прататыпа рухальнай установкі для звышгукавых лятальных апаратаў. У ТОП-10 таксама ўвайшоў калектыў аўтараў Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі (за стварэнне высокаактыўнага генна-інжынернага штаму для атрымання вакцын новага пакалення з патэнцыяльна ўзмоцненай імунагеннасцю).

Найлепшымі таксама прызнаныя аўтарскі калектыў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (за раскрыццё тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў розных жанрах кампазітарскай творчасці), вучоныя Інстытута меліярацыі (за распрацоўку комплексу найноўшых тэхналогій і тэхнічных сродкаў захавання і падтрымання працаздольнасці закрытых меліярацыйных сістэм).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Фінансы

# ЗНАКАВЫЯ — ДА ЮБІЛЕЙНЫХ ДАТ

## Сёлета Нацбанк плануе выпусціць у абарачэнне 25 памятных манет

**Як паведаміла ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка, пастановай праўлення фінансавага рэгулятара Беларусі зацверджаны пералік памятных манет, якія плануюцца да выпуску ў абарачэнне ў 2023 годзе.**

Выпуск памятных манет на прыродаахоўную тэматыку будзе прысвечаны заказніку «Свіцязянскі» ў рамках серыі «Заказнікі Беларусі» і птушцы «Звычайная туркаўка» серыі «Птушка года».

Таксама выпуск памятных манет будзе прымеркаваны да юбілейных дат: 100-годдзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і 800-годдзя з дня заснавання Нясвіжа.

Тэматыка гісторыка-культурных каштоўнасцяў будзе працягнутая памятнымі манетамі: «Гісторыя банкаў Беларусі», «Легенда аб Менеску» серыі «Легенды гарадоў Беларусі», «Калінкавіцкі строй» серыі «Беларускі народны касцюм», «Лёгкі хлеб» серыі «Беларуская народныя казкі», «Калыханка» серыі «Беларускі дзіцячы фальклор», «Матуля» серыі «Дрэва жыцця», «Беларуская батлейка», а таксама чарговымі памятнымі манетамі серый «Архітэктура Беларусі» і серыі «Жывы свет на гербах гарадоў Беларусі».

Згодна з усходнім календаром, 2024 год — год Дракона. Традыцыйна ў працяг серыі «Кітайскі каляндар» у 2023 годзе будзе выпушчаная памятная манета «Год Дракона».

Сёлета будуць таксама ўведзены ў абарачэнне манеты «Жыццё» і «Чалавек» серыі «Космас. Эвалюцыя Сусвету».

**Сяргей КУРКАЧ.**

Камунальныя стасункі

# НОВАЯ «СУПРАЦЬГАЛАЛЁДКА» ДЛЯ ЗІМОВЫХ ДАРОГ

**Сёлетняя зіма са сваімі маразамі і снегападамі беларусаў пераважна радуе. Аднак перапады тэмператур і перыядычныя празмерныя снежныя ападкі дадаюць работы камунальным службам горада. То ледзяшы з-пад страхі як на дражджах вырастаюць, то сумёты ствараюцца — ні прайсці ні праехаць, то каша на дарогах такая, што не зразумела, ці то захраснеш на дарозе, ці то слізгацець па ёй будзеш. Каб своечасова рэагаваць на настрой надвор'я, трэба не толькі снег зграбаць, але і супрацьгалалёдныя мерапрыемствы праводзіць, кажуць спецыялісты.**

Яшчэ па восені да зімовай працы былі гатовыя амаль 90 адзінак уласнай тэхнікі ЖЭУ і ЖРЭА, яшчэ амаль 200 — прыцягваюцца да работы згодна з дагаворамі. Больш за тое, адміністрацыямі кожнага раёна сталіцы вызначаны пабочныя арганізацыі, якія ў перыяд моцных снегападаў дапамагаюць камунальнікам тэхнікай. Цяпер на вуліцах Мінска штодня працуе больш за сотню адзінак тэхнікі, звыш 1600 работнікаў па комплекснай уборцы, рабочыя па бягучым рамонце і інжынерна-тэхнічныя работнікі.



А айчынныя вучоныя атрымалі даручэнне распрацаваць супрацьгалалёдныя сумесі не горш чым на Захадзе, якія б мінімальна ўплывалі на металічныя канструкцыі. Новыя сумесі айчынный вытворчасці ўжо выкарыстоўваюцца, у прыватнасці, у аэрапортах. А арганізацыі НАН хімічнага профілю прапануюць сумесі, якія змогуць замяніць сённяшнія галітныя сумесі. Так што ёсць з чаго выбіраць і што спрабаваць, лічыць **Вадзім КІЦІКАЎ, дырэктар Інстытута жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН Беларусі:**

— Распрацоўка такой сумесі — комплексная праблема, у вырашэнні якой задзейнічаны як інстытуты хімічнага профілю, так і тэхналагічнага. Навукоўцам трэба вырашыць як мінімум тры важныя аспекты. Самы галоўны датычыцца тэхналогіі вытворчасці самой сумесі. Паўстае таксама і праблема эканамічнага аналізу. А яшчэ — пытанне хімічных тэхналогій.

Работа шэрагу арганізацый Акадэміі навук у гэтым кірунку цяпер знаходзіцца на стадыі абгрунтавання, наколькі прымяняльнай можа стаць тэхналогія новых сумесяў. З аднаго боку, іх кошт будзе вышэйшы, чым у звычайных, з другога — яны будуць валодаць новымі неабходнымі ўласцівасцямі, каб захоўваць канструктыўныя элементы аўтамабіляў і дарог.

Ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам ЖКГ плануецца вызначыць, у якіх рэгіёнах будзе апрабавана новая прадукцыя. На працягу найбліжэйшага перыяду выкарыстання (падчас зімовага сезону) разам з эксплуатуючымі арганізацыямі навукоўцы мусяць знайсці лічбы, якія дазволяць колькасна ацаніць мэтазгоднасць і выйсці з больш дакладнымі прапановамі па вырабе і выкарыстанні сумесяў, удакладніў дырэктар інстытута:

— Інстытут агульнай і неарганічнай хіміі такія матэрыялы прапануе. Мяркуецца, што іх, магчыма, паспрабуюць для масавай вытворчасці і замены галітных сумесяў. Апошнія сёння маюць з плюсоў кошт, бо выпрабляюцца з адходаў вытворчасці, і маюць практыку выкарыстання. А з мінусаў — шкодны ўплыў на канструктыўныя элементы і зялёныя насаджэнні. Таму патрэбна комплексная ацэнка ў рэальных умовах.

Згодна з нарматывамі, на адзін квадратны метр вулічна-дарожнай сеткі ў залежнасці ад умоў надвор'я пасыпаецца ад 15 да 125 грамаў супрацьгалалёдных рэагентаў: галіту і пясчана-салянай сумесі. А пакуль навукоўцы працуюць над стварэннем новай «супрацьгалалёдкі», у той жа Акадэміі навук распрацавалі інгібітар, які можна дадаваць у саляныя сумесі. Такая дабаўка змяншае карозію металу і негатыўны ўплыў на зялёныя насаджэнні, таму павінна стаць добрым набыткам у барацьбе з сёлетняй галалёдзіцай.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Пазыкі амерыканскіх хатніх гаспадарак перавысілі $16 трлн



Летась сумарны доўг амерыканскіх хатніх гаспадарак павялічыўся на 7,65 працэнта ў параўнанні з папярэднім годам і дасягнуў 16,5 трыльёна долараў. Аб гэтым паведаміла выданне The Hill са спасылкай на даследаванне фінансавай кампаніі NerdWallet. Сярэднестатыстычная двогаспадарка летась запазычыла каля $222 тысяч па іпатэцы, $17 тысяч па крэдытных картах, а таксама $29 тысяч па аўтакрэдытах. Пры гэтым сумарны доўг па крэдытных картах вырас да $460 мільярдаў Эксперт NerdWallet Сара Ратнер заявіла: «Спажыўцы адчуваюць ціск больш высокіх цэн і працэнтных ставак, а зарплаты проста не паспяваюць за імі. Гэта вымушае многіх прымаць цяжкія рашэнні, напрыклад, залазіць у даўгі, каб аплаціць прадметы першай неабходнасці». Паводле даследавання, сярэдні даход хатняй гаспадаркі летась узрос на 4 працэнты, у той час як агульны кошт жыцця — на 8 працэнтаў.

## Узрост выхаду французаў на пенсію павялічыцца да 64 гадоў

Прэм'ер-міністр Францыі Элізабэт Борн выклала асноўныя кірункі французскай пенсійнай рэформы, якую ўрад



разлічвае ўвесці з 1 верасня 2023 года, паведамілі нацыянальныя СМІ. Згодна з заявай кіраўніка ўрада, узроставы парог выхаду на пенсію будзе паступова зрушвацца з 62 да 64 гадоў па тры месяцы за год, і гэты працэс працягнецца да 2030-га. Прымяняцца новы рэжым будзе, пачынаючы з пакаленняў французаў, якія нарадзіліся ў верасні 1961 года ці пасля. Аб рашучасці правесці да канца свайго мандата пенсійную рэформу прэзідэнт Эмануэль Макрон заяўляў падчас выбарчай кампаніі ў мінулым годзе. Тады ён выстаўляў прапанову пенсійнага ўзросту ў 65 гадоў у якасці адной з ключавых пазіцый другога прэзідэнцкага мандата. Але, як адзначыла газета Le Figaro, паміж двума турамі дзеля прыцягнення сімпатый левых выбаршчыкаў Макрон пагадзіўся на 64-гадовы пенсійны парог.

## У Японіі рэзка ўзрасла колькасць смерцяў ад COVID-19

У Японіі павялічылася колькасць смерцяў ад COVID-19 са снежня 2022 года — за гэты перыяд памерлі больш за 10 тысяч чалавек, паведаміла ТАСС. Паводле звестак Міністэрства аховы здароўя Японіі, у лістападзе ад каранавіруснай інфекцыі памерлі амаль тры тысячы чалавек, у снежні адбыўся рэзкі скачок захворванняў, які забраў жыцці 7622 чалавек. За першыя дзесяць дзён студзеня памерлі 3145. Найбольшая колькасць памерлых фіксуецца сярод людзей старэйшых за 80 гадоў. На гэту ўзроставую групу прыпадае каля 75 працэнтаў ад усіх смерцяў за мінулыя паўтара месяца. Паводле даных універсітэта Джона Хопкінса, у Японіі за ўвесь час пандэміі каранавіруса памерлі звыш 60 тысяч чалавек. Амаль 80 працэнтаў японцаў прышчапіліся двума кампанентамі вакцыны. У краіне цяпер не дзейнічае ніякіх супрацькаранавірусных абмежаванняў.

# «КАЛІ ЧАЛАВЕК АДНОЙЧЫ ЗРАБІЎ ДОБРУЮ СПРАВУ, ЁН НЕ ЗАСТАНЕЦЦА РАЎНАДУШНЫМ І НАДАЛЕЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Дзмітрый Яўгенавіч, Беларускі Чырвоны Крыж аб'ядноўвае тысячы валанцёраў самых розных узростаў і прафесій. Як гэта ўдаецца зрабіць?***

— Нашы валанцёры — не проста людзі, якія прыйшлі, апранулі камізэльку і пачалі нешта рабіць. Усе яны, незалежна ад дзейнасці — ці тое ўдзел у акцыях, ці тое работа з інвалідамі, пажылымі, дзецьмі, — праходзяць падрыхтоўку ў нашых школах, на навучальных семінарах. Робіцца гэта дзеля таго, каб валанцёр ведаў, як рэагаваць у той ці іншай сітуацыі. Самае галоўнае, апранаючы сімволіку Беларускага Чырвонага Крыжа, ён аўтаматычна да яго далучаецца, і важна, каб не было ўрону прэстыжу арганізацыі з-за чалавека, які не змог правільна данесці інфармацыю ці павёў сябе некарэктна.

Ёсць у нас і валанцёры, якія маюць суперпадрыхтоўку. Гэта так званыя атрады хуткага рэагавання, іх 120 чалавек. Яны прыцягваюцца да самых складаных работ: сумесна з МУС і МНС удзельнічаюць у пошуку людзей, якія згубіліся, у ліквідацыі стыхійных сітуацый — падтапленняў, пажараў — і аказанні першай дапамогі. Яны прымалі ўдзел у рабоце падчас міграцыйных крызісаў на беларуска-польскай і на беларуска-ўкраінскай граніцах. Гэтыя атрады штогод праходзяць спецыяльныя трэнінгі па аказанні першай дапамогі, псіхасацыяльнай падтрымкі, удзельнічаюць у сумесных вучэннях з МНС па зладжанасці дзеянняў.

І самае галоўнае, што мы валанцёраў не кідаем, маўляў, адпрацаваў і дзякуй. Штогод у нас праходзяць абласныя майстар-трэнінгі па выбары лепшых валанцёраў. Пасля праводзім агульны семінар на ўзроўні краіны, дзе выбіраем найлепшых. Мы прыцягваем іх да агульных адукацыйных праграм і сумеснага адпачынку. І гэта дазваляе стварыць зладжаную каманду. Ёсць валанцёры, якія супрацоўнічаюць з намі па 10 і больш гадоў.

***— Вы развіваеце мноства праектаў па дапамозе пажылым, дзецям, інвалідам. Якія з іх лічыце найбольш значнымі?***

— Дзякуючы сродкам масавай інфармацыі наша дапамога мігрантам. Але гэта толькі адзін з кірункаў работы. Мы працуем па шматлікіх сэрвісах аказання дапамогі ўразлівым катэгорыям грамадзян. Гэта дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, дзеці-інваліды, адзінокія пажылыя людзі, пенсіянеры, інваліды, у тым ліку з хранічнымі псіхічнымі захворваннямі, асобы, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі, людзі без пэўнага месца жыхарства. Мы рэагуем на розныя выклікі, напрыклад, актыўна працавалі падчас пандэміі COVID-19.

У нас шмат партнёраў: Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, МНС, МЗС, Дзяржпагранкамітэт, МУС. З многімі ведамствамі ў нас добрыя сувязі, і гэта нам дапамагае. Наша арганізацыя не фінансуецца з бюджэту, мы працуем на ахвяраванні, членскія ўзносы, але дзяржорганы дапамагаюць у выдзяленні памяшкання, у арганізацыі таго ці іншага мерапрыемства.

Хоць усе сэрвісы важныя, для мяне асабіста адзін з лепшых — «Нянька замест мамы». Калі малы з дзіцячага дома трапляе ў бальніцу, то зразумела, што за ім варта прыглядаць, пакарміць, пагуляць. Вядома, гэта кладзецца на плечы медперсаналу, але не заўсёды яны могуць шмат часу ўдзяліць. Таму мы стварылі такі сэрвіс, калі сацыяльны работнік займаецца з малым, каб ён адчуваў клопат. Спачатку мы развівалі гэты праект на спонсарскія грошы нашых замежных партнёраў, а літаральна на мінулым тыдні ў нас з'явілася мецэнат, якая на яго развіццё ахвяравала пяць тысяч рублёў. Нам гэтых сродкаў хопіць на паўгода, каб аплаціць работу сацыяльнага работніка. Пасля, магчыма, яна дапаможа яшчэ.

У Гродзенскай вобласці ёсць выдатны сэрвіс — інтэграцыйны лагер, дзе займаюцца з дзецьмі-інвалідамі, ён аб'ядноўвае каля 50 сем'яў. Там малыя з цяжкімі хваробамі апорна-рухальнага апарату, ДЦП, міястэніяй. Мы маем памяшканне, гэта палова былога дзіцячага садка. Ужо на працягу дзевяці гадоў дзеці з бацькамі прыязджаюць туды. З малымі займаюцца псіхолагі, супрацоўнікі і валанцёры. Ёсць людзі, якія былі пацыентамі гэтага цэнтра, а цяпер і самі сталі валанцёрамі. Для дзіцяці вельмі важна разумець, што яно не адно і кантактаваць са сваімі равеснікамі. Бацькам таксама важна не быць закрытымі ў чатыры сцены са сваімі праблемамі. Штогод наш спонсар, прадпрыемства «Малочный мир», выдаткоўвае грошы, і ў канцы мая на працягу сямі дзён за горадам дзеці разам з сем'ямі адпачываюць. З імі займаюцца сацыяльныя педагогі, псіхолагі, у іх забаўляльная праграма, куды запрашаем клоўнаў.

У Мінску дзейнічае выдатны сэрвіс «Адкрыты дом» для людзей з хранічнымі псіхічнымі захворваннямі. Мы супрацоўнічаем з РНПЦ псіхічнага здароўя, яго ўрачы таксама дапамагаюць. Сэрвіс накіраваны на сацыялізацыю ў грамадстве гэтых людзей, і, па сутнасці, гэта адна вялікая сям'я.

***— Летась Чырвоны Крыж адкрыў крызісныя цэнтры ў Віцебску і Брэсце. Раскажыце, для каго яны працуюць.***

— Раней іх у нас было ўсяго два: у Гродне і Гомелі. У Гродне, напрыклад, у ім жылі сем мігрантак з Блізкага Усходу з немаўлятамі, якія нарадзіліся на тэрыторыі Беларусі.

Крызісны цэнтр падобны на хостэл. Ёсць некалькі пакояў для пражывання, кухня, санвузел, пральная машына — усё, каб чалавек адзін ці з сям'ёй мог жыць. Мы забяспечваем прадуктамі, адзеннем, сродкамі гігіены. Ён разлічаны ў першую чаргу на мігрантаў, цяпер гэта ў асноўным украінцы. Напрыклад, калі чалавек прыязджае ў нашу краіну, і ў яго няма ні сяброў, ні сваякоў. Такіх людзей няшмат, і мы размяшчаем іх у крызісных цэнтрах, пакуль яны афармляюць дакументы. Потым разам з сацабаронай займаемся пытаннямі працаўладкавання. Калі яны атрымліваюць работу, ім адразу шукаюць жыллё — інтэрнат ці, калі гэта ў сельскай мясцовасці, то, магчыма, і дом. У гэты прамежак часу мы не пакідаем іх сам-насам са сваімі праблемамі.

У крызісных цэнтрах могуць пражываць людзі, якія маюць вострую патрэбу ў жыллі. Гэта людзі без пэўнага месца жыхарства, якім аднаўляюць дакументы. Ці людзі, якія страцілі жыллё ў выніку пажару, падтаплення. Па праграме з МУС там пражываюць людзі, што сталі ахвярамі незаконнага гандлю людзьмі. Мы даём магчымасць пражывання, пакуль ідуць судовыя разборы. Гэтыя цэнтры не пустуюць.



Там маюцца сэрвісы для ўразлівых катэгорый — бясплатныя цырульні для адзінокіх пажылых, паслугі па мыцці бялізны для людзей, якія не маюць сродкаў ці магчымасці гэта ажыццявіць. Ёсць пункты выдачы адзення. Ёсць аранжавыя пакоі, дзе займаюцца з дзецьмі-інвалідамі.

Нядаўна крызісны цэнтр у Гомелі атрымаў свой абгрэйд — яны ледзь не на палову павялічылі сваё плошчы. У першай палове мінулага года мы адкрылі цэнтр у Брэсце, і літаральна перад новым годам — у Віцебску. Цяпер іх чатыры. Плануецца адкрыццё крызіснага цэнтра ў Магілёве, нам ужо выдзелілі памяшканне. Сёлета, мяркую, мы яго адрамантуем і пачнём працаваць. Ёсць задумы пашырыць цэнтр у Гродне, будзем шукаць новае памяшканне.

***— Вы згадалі бежанцаў з Украіны. Але вы дапамагаеце не толькі тым, хто пераехаў у нашу краіну, а і дзецям, якія прыязджаюць у Беларусь на аздараўленне. Напрыклад, нядаўна ў Наваполацк прыязджалі дзеці з Лісічанска...***

— Прыязджае вялікая колькасць дзяцей з Украіны праз дабрачынны фонд імя Аляксея Талая. Калі да нас звяртаюцца, мы заўсёды стараемся дапамагчы. Летам мы дапамагалі з аздараўленнем 87 дзяцей з Украіны ў нашых санаторыях.

Цяпер больш за чатыры дзясяткі дзяцей прыязджалі ў Наваполацк, гарадскія ўлады папрасілі нас падключыцца. Дзеткам мы падарылі спартыўнае адзенне і абутак, спартыўны інвентар. Каля месяца яны правялі ў Беларусі. У іх тут была вялікая праграма, улады зрабілі ўсё, каб дзеці маглі і адпачыць, і павучыцца — гэта і школьныя заняткі, і спартыўная праграма, басейн, наведванне цырка, іншыя экскурсіі. Яны засталіся задаволенымі, вельмі цёпла развітваліся, расказвалі, як ім спадабалася.

Гэта важная работа, і якімі б ні былі канфлікты, дзеці павінны мець дзяцінства, і яго мусіць суправаджаць дабрыня. Малыя, якія да нас прыязджаюць, доўгі час не бачылі нармальных умоў. Яны з блізкімі сядзяць у падвале ці ў доме, дзе няма ні вады, ні святла, а ежу гатуюць на вогнішчы. У нас увечары яны па звычцы маглі сядзець у цемры, педагогі пытаюць, чаму не ўключаеце святло, а яны кажуць: а мы забылі, што яно ёсць. Іх здзіўляе, што ў прыбіральні ёсць вада.

Для дзяцей мы робім усё магчымае. І яны разумеюць, што Беларусь — гэта спакойная краіна, дзе ўвечары свецяцца вокны і ліхтары, ездзяць машыны. Для іх гэта зусім іншае жыццё.

***— Адзін са складнікаў работы Чырвонага Крыжа — аказанне дабрачыннай дапамогі. Адна з такіх акцый, якая доўжыцца да 14 студзеня, — «Ёлка жаданняў», былі і праекты для пажылых людзей...***

— Так, увосень праводзілася акцыя «Наша дапамога», накіраваная на падтрымку пажылых, інвалідаў, адзінокіх людзей. Мы набываем прадукты, сродкі гігіены, якія раздаём такім людзям. Зразумела, што ў нас ёсць і нашы айчынныя спонсары, і міжнародныя, якія выдаткоўваюць на гэта сродкі. Аднак найперш гэтыя акцыі праводзяцца для шырокага ўцягвання ў дабрачыннасць нашых людзей. Кожны можа прынесці адзенне, сродкі гігіены, прадукты. Не прынцыпова, колькі грошай можа выдзеліць чалавек. Калі ён пералічыў невялікую суму, пару рублёў, ён далучыўся да добрай справы. Для нас самае важнае — не памер спонсарскай дапамогі, а аб'ём. Чым больш людзей уцягваецца ў працэс дабрачыннай дапамогі, тым лепш. У апошняй акцыі «Наша дапамога», дарэчы, паўдзельнічала 11 тысяч чалавек.

«Ёлка жаданняў» — класная рэч з гэтага пункту гледжання таксама. Такія ёлкі з пісьмамі і пажаданнямі дзяцей выстаўляюцца ва ўсіх абласных цэнтрах і ў Мінску ў буйных гандлёвых дамах. Апроч таго, адкрываецца дабрачынная акцыя, дзе людзі могуць прынесці цацкі. Можна пералічыць грашовыя сродкі, а можна выканаць пажаданні канкрэтных дзяцей.

У 2021 годзе на гэтай пасадзе была мая першая «Ёлка жаданняў» у Гродне. Мы з нашым цэнтральным офісам сабралі грошы і пералічылі іх мясцоваму дзіцячаму інтэрнату. Я перачытаў мноства пісем, каб зразумець, чаго хочуць сучасныя дзеці. Усё гэта даволі кранальна: «Маша, 6 гадоў, я хачу ружовы рукзачок ці запісную кніжку». «Вадзім, 9 гадоў, хачу, каб маёй сястрычцы Дзед Мароз падарыў зімовыя бацінкі»... Гэта не пакідае нікога раўнадушным.

Так атрымалася, што перад Новым годам я ездзіў таксама ў Гродна. Выцягнуў жаданне трохгадовага хлопчыка з Украіны, ён папрасіў экскаватар. Кіраўніцтва аднаго з буйных цэнтраў раней не вельмі ахвотна ішло на кантакт, а сёлета пагадзілася паставіць у сябе «Ёлку жаданняў». Дырэктар, калі пачытала пажаданні, набыла адразу 11 падарункаў. І на наступны год паабяцала абавязкова ўдзельнічаць. Калі чалавек зрабіў добрую справу, ён не можа застацца раўнадушным і надалей.

У Гомелі, Магілёве, Віцебску ў нас праходзяць маштабныя навагоднія акцыі. У Мінску знайшлі спонсараў, набылі білеты і зладзілі для дзяцей паход у цырк. Добрых спраў шмат, калі кіраўнікі абласных арганізацый расказваюць па панядзелках што зроблена, падсілкоўваешся гэтай энергетыкай.

***— Пасля падзей 2020 года былі звароты ў міжнародныя арганізацыі, у тым ліку ў швейцарскі Чырвоны Крыж, каб той паўплываў на вашу арганізацыю. Гэта перашкаджае рабоце?***

— Так, людзі сядзяць за мяжой і пішуць лісты з патрабаваннем выключыць нас з Міжнароднага руху Чырвонага Крыжа, бо мы не пайшлі ў турмы...

***— Здаецца, Чырвоны Крыж аказвае дапамогу зняволеным, у тым ліку гігіенічнымі наборамі...***

— Але толькі не грамадзянам Рэспублікі Беларусь. Калі пра чалавека ёсць каму паклапаціцца, то няхай пра яго і паклапоцяцца блізкія. Не важна, па якім артыкуле ён затрыманы, у яго ёсць сваякі, якія могуць згодна з нарматыўнымі дакументамі насіць перадачы ці адпраўляць пасылкі. Такі прынцып быў ва ўсе часы. Работа ў месцах пазбаўлення волі — не наша статутная дзейнасць. Статут Беларускага Чырвонага Крыжа не павінен ісці ўразрэз з асноўным статутам руху Чырвонага Крыжа і мусіць адпавядаць нашаму заканадаўству. І гэта пільна адсочваецца Міжнародным камітэтам Чырвонага Крыжа.

Мы аказваем дапамогу тым, хто апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, і акрамя Чырвонага Крыжа яму няма каму дапамагчы. Калі чалавек знаходзіцца пад следствам ці крымінальным праследаваннем, то ён знаходзіцца пад апекай дзяржавы і забяспечаны адзеннем, ежай і сродкамі гігіены.

Мы супрацоўнічаем з Дзяржпагранкамітэтам і МУС па затрыманых нелегальных мігрантах, якія знаходзяцца ў іх следчых ізалятарах. Калі чалавек не мае грашовых сродкаў і магчымасці штосьці набыць, і няма нікога, хто яму дапаможа, то ў нас ёсць магчымасць наведвання гэтых следчых ізалятараў. Мы валодаем інфармацыяй, колькі нерэгулярных мігрантаў знаходзіцца ў ізалятарах у абласцях. І калі яны маюць патрэбу ў дапамозе, мы яе аказваем — прадуктамі, адзеннем, сродкамі гігіены.

**Алена КРАВЕЦ.**

*Цалкам матэрыял на zviazda.by*

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

12 СТУДЗЕНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15945)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

# Каманда КВЗ «Доктар Хаусс»: «Коратка і смешна». І — пераможна!

**«На сцэне каманда з Беларусі. Ну, Беларусь, Беларусь...» і шматтысячная зала замірае ў чаканні новага працягу, які ёмiста апісвае ўсе «разынкі» Сінявокай. Гэтыя вітальныя словы хлопцаў з Магілёва на працягу чатырох гадоў прыцягвалі да экранаў прыхільнікаў гульні па ўсім свеце. І не таму, што беларусы на расійскай сцэне КВЗ — з'ява адносна рэдкая, а таму, што чатыры хлопцы ў дзелавых касцюмах умеюць рабіць «коратка і смешна» лепш за астатніх. У выніку «Доктар Хаусс» стаў чэмпіёнам Вышэйшай лігі КВЗ-2022. Шлях даўжынёй у 14 гадоў, асабісты педагог па вакале — пра ўсё гэта і не толькі — у інтэрв'ю з капітанам Паўлам МАЛАХАВЫМ.**



***— Гісторыя «Доктара Хаусса» пачалася яшчэ ў далёкім 2008 годзе са школьнай каманды. І назву вы абралі ў гонар папулярнага тады серыяла, дадаўшы другую «с» на канцы як фішку. На сцэне вас чацвёра, зараз усе ўдзельнікі каманды жывуць у Магілёве?***

— Сёння нас засталося двое: я і Саша Снапкоўскі. Сяргей Мурашка з Жодзіна, Гардзей Яршоў, родам з Гомеля, цяпер жыве ў Мінску. «Доктар Хаусс» сёння — гэта ўжо зборная Беларусі, таму што ў нашай камандзе ёсць прадстаўнікі ўсіх абласцей.

***— Чаму вы абралі для сябе дзелавы стыль? Зараз каманды, як правіла, спрабуюць вылучацца яркімі і запамінальнымі касцюмамі, а вы строга ў чорна-белым?***

— Таму што ў Магілёве каляровае трэба заслужыць (*усміхаецца*). Мы пачыналі ў нулявых, калі «разрывала» каманда «Максімум», дзелавы стыль з экрана глядзеўся клёва. Тады ў прынцыпе была мода на пінжакі, да іх мы праз столькі гадоў і дараслі. Да Прэм'ер-лігі сабралі грошай і купілі такія прыгожыя сабе, а ў «вышку» ўвайшлі ўжо ў адзіным стылі, касцюмам і праўда тры гады (спасылка на адарваны цэннік у фінальным прывітанні). Гэта калі разважаць аб форме, а калі аб стылі, то гэта своеасаблівы парадокс: гаварыць з сур'ёзным тварам аб несур'ёзных рэчах. І самае галоўнае — мы ніколі не спрабавалі выдаваць сябе за тых, кім не з'яўляемся. Стварць вобразы паводле падабенства, грунтуючыся на факце, што людзі заўсёды будуць смяяцца з тых, кім стаць не хацелі б, — самы просты ход, а заставацца сабой, як бы дзіўна ні гучала, заўсёды складаней. Гэтым ганарымся.

***— Вы ўвайшлі ў гісторыю не толькі планеты КВЗ, але і нашай краіны. За апошнія 21 год беларусы ўпершыню сталі чэмпіёнамі Вышэйшай лігі, за апошнія 17 гадоў толькі вы прывезлі дадому малога КіВіНа ў залатым. Якія адчуванні?***

— Вялікая радасць, але пакуль да канца яе не асэнсавалі. Думаю, што ўсведамленне перамогі прыйдзе праз пару гадоў, калі зробім нешта значнае для нашага, беларускага КВЗ. Гэта цяпер асноўная задача. Галоўнае, што ў нас ёсць перспектыўныя беларускія каманды, якія мы пакінем пасля сябе. Чэмпіёнства — не проста медалі і слава, высокі паказчык асобаснага росту, але і вялікая рызыка. Ставіш на кон усё: час, сілы, а атрымаецца ці не — гэтага загадзя не ведае ніхто. Мы паставілі — у нас атрымалася.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Трэці працоўны

## СТУДАТРАДЫ — БРЭНД ДЗЯРЖАЎНАЙ МАЛАДЗЁЖНАЙ ПАЛІТЫКІ

### Сфера іх дзейнасці — ад будоўлі і сельгаспалеткаў да медыцынскіх установ

**У 2022 годзе Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў працаўладкаваў больш як 42 тысячы чалавек у складзе 2861 студэнцкага атрада.**

**Напрыканцы года ў Мінску на вялікай лядовай арэне спартыўна-забаўляльнага комплексу «Чыжоўка-Арэна» прайшло афіцыйнае закрыццё трэцяга працоўнага семестра, прысвечанага Году гістарычнай памяці. Цэнтральнай падзеяй стала ўрачыстая цырымонія ўшанавання пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Працоўны семестр» на найлепшы студэнцкі атрад і найлепшую арганізацыю, якая прымала студэнцкі атрад. Цырымонія стала адной з самых маштабных для беларускіх студэнцкіх атрадаў у гісторыі незалежнай Беларусі: на мерапрыемства было запрошана больш як шэсць тысяч чалавек — камандзіры, камісары, байцы студэнцкіх атрадаў, ветэраны студатрадаўскага руху, прадстаўнікі маладзёжнай агульнарасійскай грамадскай арганізацыі «Расійскія студэнцкія атрады» (партнёра БРСМ).**




*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Знайсці сябе

## «ЛЮБЛЮ САВЮ РАБОТУ ЗА ПАСТАЯННАЕ ПАЧУЦЦЁ ПАЛЁТУ»,

### ці Як гэта — быць інструктарам парашутнага спорту

**Кожны з нас, мабыць, некалі марыў навучыцца лётаць у аблоках, як птушка. Для большасці гэтая мэта так і засталася недасягальнай, але дваццацічатырохгадовы парашутыст з Мінска Вадзім ТКАЧОЎ змог не толькі сам пакарыць абшары неба, але і ажыццявіць мару вольнага палёту соцень людзей.**

— У парашутны спорт я трапіў зусім выпадкова. Аднойчы па дарозе ва ўніверсітэт мне сказалі, што ідзе набор у мінскім аэраклубе ў адпаведную секцыю. Мяне гэта зацікавіла, таму прыйшоў на першы занятак. Шчыра кажучы, не асабліва верыў, што гэтаму віду спорту можна навучыцца бясплатна, думаў, што парашутызм — для людзей ваенных або заможных, якія могуць дазволіць сабе скачкі з самалёта, але, як аказалася, у нас ёсць бюджэтная праграма, на якую я і трапіў. Сама яна была складзена на сорак гадзін і змяшчала розныя напрамкі. Напрыклад, мы вывучалі матэрыяльную частку парашута, асновы скачка і многае іншае. Пасля заняткаў здаецца залік і навучанне лічыцца паспяхова завершаным.



*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*




# СТУДАТРАДЫ — БРЭНД ДЗЯРЖАЎНАЙ МАЛАДЗЁЖНАЙ ПАЛІТЫКІ

## Хто стаіць за кожнай лічбай?

— Гэты год для студатрадаўскага руху склаўся вельмі ўдала. Але мы не гонімся за лічбамі, а працуем найперш на якасць і развіццё карпаратыўнай культуры, бо тое, што нежывое, несапраўднае, развівацца не будзе, — разважае **другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ПРОХАРАЎ.** — За кожнай лічбай стаіць канкрэтны малады чалавек, які вясной, летам і восенню атрымаў магчымасць працаўладкавацца і падзарабіць. Байцы студатрадаў былі задзейнічаны ва ўсіх сферах дзейнасці: дапамагалі ва ўмацаванні харчовай бяспекі краіны — працавалі на ўборцы ўраджаю, у медыцынскіх установах, аздараўленчых лагерах, на флагманскіх прамысловых прадпрыемствах: МАЗе, МТЗ, «Атланце», «Гомсельмашы».

Зыходзячы са стратэгіі развіцця нашай арганізацыі, мы робім сёння акцэнт на рэалізацыі рэспубліканскіх і абласных працоўных праектаў. Рэспубліканскі праект павінен ахопліваць моладзь з розных рэгіёнаў краіны (не менш як з чатырох абласцей). У чым сэнс? Маладыя людзі разам працуюць, пражываюць у адным месцы, для іх арганізоўваецца вялікая культурна-экскурсійная, грамадзянска-патрыятычная і спартыўная праграмы. Для абласных працоўных праектаў таксама абавязковая ўмова — прыцягненне моладзі з розных раёнаў адной вобласці.

У 2022 годзе былі рэалізаваны рэспубліканскія маладзёжныя працоўныя праекты, сярод якіх Усебеларуская маладзёжная будоўля «Хатынь» на аб'ектах капітальнага рамонту і рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу, Усебеларуская маладзёжная будоўля ў Астраўцы («Горад маладосці»), вытворчыя працоўныя праекты «Атлант», «Трактарабудаўнік», «Аўтазаводзец», педагагічны праект «Важаты» на базе Нацыянальнага дзіцячага цэнтра «Зубраня», а таксама будаўнічы «Пуцейцы» і сэрвісны «Дарога магчымасцяў» — праекты на аб'ектах Беларускай чыгункі.

Як мы пераканаліся, менавіта рэспубліканскія працоўныя праекты даюць магутны штуршок для развіцця карпаратыўнай культуры і ўвогуле для развіцця студатрадаўскага руху ў Беларусі, які стаў брэндам не толькі БРСМ, а ўвогуле дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

У час працоўнага семестра праведзены шэраг працоўных акцый грамадзянска-патрыятычнага напрамку. Сярод іх — акцыя «Іх імёнамі названы студэнцкія атрады», скіраваная на фарміраванне маральных арыенціраў і павагі да гераічнага мінулага Беларусі.

Зусім хутка (пасля здачы зімовай сесіі) у нашай краіне стартуе патрыятычная акцыя «Зімовы маршрут», арганізатарам якой выступае Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ. Шлях байцоў зводных студатрадаў будзе пралягаць праз невялікія гарады і пасёлкі, дзе студэнты арганізуюць шэраг прафарыентацыйных інтэрактываў, тэматычных заняткаў, канцэртных і сацыяльна значных праграм, дапамогуць у расчыстцы ад снегу помнікаў і абеліскаў, акажуць шэфскую дапамогу па гаспадарцы ветэранам, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і проста адзінокім пажылым людзям.

## За 8 тысяч кіламетраў ад дома...

Як заўважыў Аляксандр Прохараў, падчас вызначэння пераможцаў конкурсу на найлепшы студатрад пад увагу браліся не толькі паказчыкі працоўнай дзейнасці, але і згуртаванасць будатрадаўцаў, іх актыўны ўдзел у спартыўных спаборніцтвах, творчых мерапрыемствах, мерапрыемствах патрыятычнай накіраванасці і гэтак далей.



Па выніках конкурсу «Працоўны семестр» у намінацыі «Пераходзячы сцяг найлепшаму студэнцкаму будаўнічаму атраду» перамог студэнцкі будаўнічы атрад «Эўрыка» імя Героя Савецкага Саюза Віктара Яроньні. Будатрад быў сфарміраваны штабам працоўных спраў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай і працаваў на міжнароднай будоўлі «Касмадром Усходні».

— Беларусь і Амурскую вобласць раздзяляюць 8 тысяч кіламетраў. І мы вельмі ганарымся нашымі хлопцамі, якія годна прадставілі ў Расійскай Федэрацыі і Саюза моладзі, і свой універсітэт, і нашу краіну, — падкрэслівае Аляксандр Прохараў.

На «Касмадроме Усходні» беларусы працавалі на будаўніцтве метэастанцыі, жылога фонду, былі задзейнічаны ў дарожных і аздабленчых работах. Дарэчы, у кампаніі хлопцаў трапілі і трое дзяўчат. Як расказалі самі маладыя людзі, большасць з іх да гэтага моманту ніколі не лятала на самалётах. Нікалі не былі ў расійскай глыбінцы, таму гэта вандроўка запомніцца надоўга...

Найлепшым выязным педагагічным атрадам, які працаваў за межамі краіны, стаў атрад «Фенікс» імя Героя Савецкага Саюза Аляксандра Азончыка з Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

Шчыра кажучы, не ўсім даецца шанц папрацаваць у такім месцы, як Усерасійскі дзіцячы цэнтр «Арляня», дзе сустракаюцца найлепшыя педагагічныя атрады з усёй Расіі, і правесці лета на марскім узбярэжжы ў Краснадарскім краі. А менавіта там летам 2021 года «Фенікс» атрымаў першае «баявое хрышчэнне».

«Арляня» — маштабная тэрыторыя магчымасцяў. За адну змену (21 дзень) яго выхаванцы пражываюць надзвычай насычанае жыццё, успаміны пра якое пранесуць праз гады. А цяпер часткай іх успамінаў будуць і важатыя з Беларусі, якія ўжо два гады запар (з сярэдзіны мая і да канца жніўня) арганізоўваюць для іх сапраўднае свята.

— Мы праводзім там амаль чатыры месяцы. Дарога займае каля трох дзён. І перыяд адаптацыі для навічкоў, якіх сёлета ў нас было шмат, даволі складаны, — расказвае **камісар атрада Кацярына ФОФАНАВА.** — У гэтай сітуацыі на дапамогу прыходзяць сябры, якія заўсёды дапамогуць і падтрымаюць. Шчыра кажучы, за лета так моцна стамляешся, што кажаш сабе: «Усё, трэба ставіць кропку!». Але ўжо праз тыдзень пасля вяртання на радзіму пачынаеш сумаваць па дзецях, і калі вясной у цябе пытаюцца «Ну што, паедзеш?», ты ўпэўнена адказваеш: «Канешне!». Мы падтрымліваем праз сацыяльныя сеткі сувязь з нашымі выхаванцамі, яны нам пішуць, расказваюць пра сябе, радуюцца поспехам і перамогам.

## «Памяць і Слава»: вяртанне імён

У БНТУ ў 2022 годзе было створана 53 студэнцкія атрады агульнай колькасцю 1703 чалавекі.

— Мы ахапілі практычна ўсе профілі, за выключэннем медыцынскіх і сельскагаспадарчых атрадаў, — расказаў **сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Ягор НІКІЦІН.** — Быў у нас і педагагічны атрад, які працаваў у санаторыі-прафілакторыі БНТУ «Палітэхнік». А сэрвісны атрад шчыраваў у Краснадарскім краі, у аздараўленчым лагеры «Марская хваля».

Нашы студэнты працавалі фактычна на ўсіх знакавых аб'ектах і рэспубліканскіх праектах: «Аўтазаводзец», «Трактарабудаўнік-2022», «Атлант», Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк, на рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Акрамя таго, мы вельмі ўдзячныя кіраўніцтву нашай ВНУ, якое выдзеліла шмат месцаў для працаўладкавання непасрэдна ва ўніверсітэце: хлопцы і дзяўчаты працавалі на кампусе, у студэнцкім гарадку (а ў нас 18 студэнцкіх інтэрнатаў), дапамагалі з метадычнай дакументацыяй на кафедрах.

— У Беларускім дзяржаўным універсітэце арганізавалі 41 атрад, дзе былі задзейнічаны 968 байцоў. Для нас гэта рэкордныя лічбы, — канстатуе **начальнік аддзела маладзёжнай палітыкі ВНУ Вікторыя ДВАРЭЦКАЯ.** — Для папулярызацыі студатрадаўскага руху мы праводзім маштабныя іміджавыя кампаніі на кожным факультэце, задзейнічаем сацыяльныя сеткі «Інстаграм», TikTok і «Тэлеграм».

Асобна трэба спыніцца на рабоце студэнцкага сэрвіснага атрада «Памяць і Слава» імя першага рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты, створанага на гістарычным факультэце. Яго ўдзельнікі працуюць увесь год: займаюцца даследаваннем архіўных дакументаў, вывучэннем публікацый цэнтральнага перыядычнага друку Беларусі пасляваеннага перыяду ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Такім чынам былі ўстаноўлены прозвішчы яшчэ 30 супрацоўнікаў БДУ.

Акрамя таго, студатрадаўцы займаюцца добраўпарадкаваннем пахаванняў прафесарска-выкладчыцкага саставу ўніверсітэта на Ваенных, Паўночных і Усходніх могілках Мінска. Работа па пошуку і добраўпарадкаванні пахаванняў супрацоўнікаў БДУ вядзецца з 2020 года.

Таксама будучыя гісторыкі правялі маштабную работу па ўстанаўленні біяграфічных даных ваеннапалонных лагера «Шталаг-352» у Масюкоўшчыне. Хлопцы і дзяўчаты вялі пошук і верыфікацыю звестак аб вязнях па кнізе памерлых лазарэта лагера. Усяго ўдалося знайсці інфармацыю аб 789 людзях. Сабраны матэрыял папоўніць рэспубліканскую базу даных.

«Мы лічым такую форму выхаваўчай работы з моладдзю вельмі эфектыўнай», — падкрэслівае Вікторыя Дварэцкая.

## Рабочая спецыяльнасць... для студэнта

Кажучы аб далейшых перспектывах студатрадаўскага руху, Аляксандр Прохараў паведаміў, што планы амбіцыёзныя, але выканальныя:

— Падпісана пагадненне з Беларускай чыгункай. Гэта той напрамак, дзе мы бачым дадатковыя рэзервы для працаўладкавання студэнцкай моладзі. Там патрабуюцца не толькі праваднікі для цягнікоў, але і манцёры пуцей, і слесары рухомага саставу. Да таго ж сёння ёсць запыт з боку моладзі — студэнты хочуць паралельна з вышэйшай адукацыяй атрымаць дадаткова яшчэ і рабочую спецыяльнасць. Наймальнікі таксама зацікаўлены ў больш кваліфікаваных кадрах. Мы правялі сур'ёзнае анкетаванне ў ВНУ і бачым ТОП запатрабаваных спецыяльнасцяў.

Разам з міністэрствамі адукацыі, працы і сацыяльнай абароны і Рэспубліканскім інстытутам прафесійнай адукацыі зараз прапрацоўваецца пытанне аб праходжанні кароткатэрміновых прафесійных курсаў з выдачай адпаведных пасведчанняў. Разлічваем, што ўжо ў 2023 годзе гэты механізм запрацуе. І атрыманне дадатковай рабочай спецыяльнасці дазволіць моладзі апынуцца ў складзе студатрадаў на больш адказным участку працы і атрымаць больш высокі заробак.

«Вельмі здорава, што ў свой час кіраўнік дзяржавы даў даручэнне аднавіць студатрадаўскі рух і ў далейшым вывесці яго на новы ўзровень, — падкрэслівае Аляксандр Прохараў. — Сёння мы знайшлі механізмы, каб максімальна эфектыўна выкарыстоўваць указ Прэзідэнта як для канкрэтнага маладога чалавека, прадпрыемства, арганізацыі, так і для краіны ўвогуле».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота brsm.by**

Па выніках конкурсу «Працоўны семестр» ЗАТ «Атлант» перамагло ў намінацыі «Пераходзячы сцяг найлепшай арганізацыі, якая прымае». На прадпрыемстве з чэрвеня да снежня быў рэалізаваны маладзёжны вытворчы працоўны праект «Атлант-2022» з удзелам больш як 600 чалавек.

У намінацыі «Найлепшы будаўнічы атрад» пераможцамі сталі студэнцкі будатрад імя Героя Савецкага Саюза Аляксея Церашкова (Беларуска-Расійскі ўніверсітэт), а таксама атрады «Спадчына 2022» (Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт), які працаваў на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Хатыні, і «Альфа» (Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай), які шчыраваў на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Астраўцы.

Найлепшымі сельскагаспадарчымі атрадамі прызнаны атрад «Пушчанцы» (Камянецкая раённая арганізацыя БРСМ) і атрад «Парачанка» (Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт).

Сярод педагагічных атрадаў першынство ў конкурсе заваявалі атрады «Новае пакаленне» (Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна), «Сузор'е» (Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка) і «Фенікс» (Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава).

Пераможцамі ў намінацыі «Найлепшы экалагічны атрад» прызнаны студэнцкія атрады «Флора» (Шчучынская раённая арганізацыя БРСМ) і «Буравеснік» (Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж).

Найлепшым медыцынскім атрадам прызнаны атрад «Рытм» (Магілёўскі дзяржаўны медыцынскі каледж), сэрвісным — атрад «Локан» (Гомельскі дзяржаўны каледж бытавога абслугоўвання), вытворчым — атрад «Эйфарыя» (Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай), які працаваў на Маладзёжным вытворчым працоўным праекце «Атлант-2022».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

# «ЛЮБЛЮ СВАЮ РАБОТУ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Свой першы скачок Вадзім запомніў на ўсё жыццё. І, нягледзячы на распаўсюджаны міф аб тым, што першы палёт здзяйсняюць заўсёды з інструктарам, дэбютаваў у небе самастойна.

— Быў яркі сонечны дзень, неба — абсалютна бясхмарнае, проста ідэальнае надвор'е для скачка. Больш за ўсё мне запомнілася пачуццё, калі пакідаў самалёт. Заплюшчваю вочы, але сонца настолькі яркае, што праз павекі пранікае, і атрымліваецца такая ружовая заслона. Потым адкрываю парашут і атрымліваю асалоду ад скачка і відаў вакол мяне. Страху не было абсалютна, бо яшчэ перад пачаткам я візуалізаваў у сябе ў галаве скачок і з нецярпеннем яго чакаў.

Прайшоўшы курс навучання па парашутным спорце, наш герой уцягнуўся ў справу. Ён вырашыў развівацца ў гэтым напрамку. Стаў не толькі сам удасканальвацца ў скачках як спартсмен, удзельнічаючы ў розных спаборніцтвах і нават атрымліваючы прызавыя месцы, але і вырашыў асвоіць прафесію інструктара пасля заканчэння ўніверсітэта і службы ў дэсантных войсках.

— Вылучыць, што самае складанае ў рабоце інструктара па парашутным спорце, дастаткова складана. Я сказаў бы, што гэта ў цэлым не простыя занятак. Калі я ўжо прыступіў да гэтай работы, зразумеў, што мне не хапае некаторых ведаў. Напрыклад, адна справа, калі ты ўкладваеш парашут сабе і потым яшчэ нехта гэта правярае, і зусім іншая, калі ты ўкладваеш камусьці і правяраеш яго сам, пры гэтым цалкам беручы адказнасць за жыццё чалавека. Таму прыйшлося ўдасканальваць свае навыкі, ацаніўшы іх, так скажам, ужо з боку інструктара, а не проста спартсмена.

З новай пасадай наш герой набыў і новыя абавязкі, якія, як правіла, залежаць ад жадання кліента. Калі чалавек тэлефануе ў аэраклуб, у яго заўсёды ўдакладняюць: суразмоўнік хоча здзейсніць тандэм-скачок ці самастойны палёт. Калі выбірае другі варыянт, то для пачатку ён павінен наведаць заняткі, на якіх інструктар азнаёміць з тэорыяй і практыкай, дапаможа падпісаць дагавор, праверыць медыцынскую даведку, надзець усю экіпіроўку, праверыць парашутную сістэму і толькі пасля гэтага дапусціць да скачка. Калі выбіраюць тандэм-скачок, тут усё прасцей. Інструктар расказвае тэхніку бяспекі, падрыхтоўвае ўсё да скачка, зноў жа правярае медыцынскую даведку і непасрэдна з кліентам ажыццяўляе парны скачок.

— Цяпер вельмі вялікі попыт на скачкі ў тандэме. Шчыра кажучы, мне больш падабаюцца адзіночныя, але ў тандэме людзі адчуваюць сябе больш бяспечна, ды і ўмовы надвор'я для такога скачка падабраць лягчэй. А вось вышыня, дарэчы, у тандэмных большая — дзве тысячы пяцьсот метраў, тады як у адзіночных — васемсот метраў. Але і там, і там упершыню людзі атрымліваюць каласальнае задавальненне і запамінаюць гэтыя ўражанні на ўсё жыццё.

На жаль, не кожны чалавек зможа дазволіць даставіць сабе такое задавальненне, і пытанне тут нават не ў фінансавым плане. Як ужо згадваў раней Вадзім, кожны ахвотны перад скачком павінен прынесці інструктару даведку аб стане здароўя, асабліва пільна яна разглядаецца пры самастойных скачках. Гэтак жа ў тандэмных скачках існуе такое паняцце, як перавага, калі кліент важыць нашмат больш, чым інструктар, тады апошні мае права адмовіць у скачку, калі разумее, што гэта можа быць небяспечна. А вось па ўзросце абмежаванні не такія строгія. Напрыклад, скачкі ў тандэме можна здзяйсняць з васьмі гадоў, а адзіночна — з пятнаццаці, натуральна з дакументальнага дазволу бацькоў.

— Часта перад палётам у людзей узнікае страх: «а раптам парашут не раскрыецца?», але парашутная тэхніка дастаткова сур'ёзна правяраецца па некалькі разоў, і нават калі падчас скачка раптам нешта пойдзе не так, то запасны парашут заўсёды ў працоўным стане. Але не буду хаваць, траўмы ў гэтай справе ўсё ж такі здараюцца, але не падчас палёту, а пры прызямленні. Напрыклад, чалавек з вагой у пяцьдзясят кілаграмаў зробіць канчатак палёту нашмат плаўней, чым з дзевяноста. Хоць зноў жа ўсё яшчэ можа залежаць ад фізічных магчымасцяў.



Фота дадзены героем.

Работа інструктара парашутнага спорту ўключае і навыкі псіхолага. Кожны чалавек па-рознаму рэагуе на новыя ўражанні, камусьці хапае агульнай падтрымкі, а некаму трэба ўдзяліць асобную ўвагу і падтрымаць у такі адказны момант.

— Хтосьці прыходзіць у парашутны спорт у пошуках адрэналіну. Іншыя, наадварот, знаходзяць у вольным падзенні ў нябёсах свой спакой, некаторыя жадаюць удасканальвацца як спартсмены, адточваючы навыкі скачкоў і акрабатыкі. Я шчаслівы, што ў мяне такая прафесія, у якой са мной увесь час пачуццё палёту і нейкай свежасці. Ну і, вядома ж, мне вельмі падабаецца, што кожны раз людзі ў скачку са мной у тандэме вызваляюцца ад страху вышыні ці выконваюць мару ўсяго свайго жыцця, атрымліваючы непадробныя эмоцыі.

**Ангеліна НОВІКАВА.**

*Свая вышыня*

# АД ШКОЛЬНАГА СТАДЫЁНА — ДА МАЙСТРА СПОРТУ

**Лёгкая атлетыка ўключае мноства розных дысцыплін: бегавыя віды, спартыўную хадзьбу, мнагабор'е, кросы і тэхнічныя віды спорту. Майстру спорту па трыятлоне і лёгкай атлетыцы мінчаніну Дзянісу ГАРДЗІЕНКА ўдаецца іх сумяшчаць. Як?**

— Мая спартыўная кар'ера пачалася, калі я перайшоў у старшую школу. На ўроках фізкультуры мы каталіся на лыжах, бегалі на розныя дыстанцыі. Я ўжо тады ўсведамляў, што спорт мне даецца лёгка. Бегаў хутчэй за ўсіх у сваёй школе. Калі першы раз прабег дыстанцыю ў адзін кіламетр, мяне проста ўцягнула ў свет спорту. З гэтага моманту вырашыў, што буду прысвячаць яму ўсё сваё жыццё, — расказвае суразмоўнік.

Ён кажа, што любоў да спорту не перадалася яму ад бацькоў, яны не захапляюцца ім, у сям'і Дзяніс адзін такі. Тата ўсё жыццё працаваў на будоўлі, маці — у школе. Суразмоўнік кажа, што вельмі ўдзячны ім за тое, што выхавалі яго правільным чалавекам. Бо ў спорце важная не толькі сіла, але і падтрымка, любоў бацькоў, што ён і атрымлівае да гэтага часу ў поўным аб'ёме ад мамы і таты.

— Калі чалавек займаецца некалькімі відамі дзейнасці, ён развіваецца — так і ў спорце. Ёсць віды, якія цяжка сумяшчаць, напрыклад, бокс і лёгкую атлетыку. Гэтымі двума відамі я займаўся адначасова: шэсць разоў на тыдзень лёгкай атлетыкай, тры разы на тыдзень, па вечарах, адпрацоўваў асноўныя ўдары ў боксе. Для чаго? Адказ просты — для ўдасканалення сябе. Мне заўсёды было цікава, як жа людзі трэніруюцца ў іншых відах спорту, таму я спрабаваў розныя. Па сакрэце, барацьба, футбол, баявыя адзінаборствы, лапта, жым лежачы — гэта ўсё было маім хобі. І толькі лёгкая атлетыка для мяне — праца, тут ніколі не мог даць сабе слабіну. Так, нехта можа сказаць, што я дасягнуў добрых вынікаў у тых відах, якія аднёс да хобі, але я вас запэўніваю, што ўсё гэта прыйшло дзякуючы заняткам лёгкай атлетыкай, менавіта там я выхаваўся як баец.

Цяпер Дзяніс трэніруецца пяць разоў на тыдзень. Гэты графік накіраваны на ўтрыманне фізічнай формы. У яго ўваходзяць трэніроўкі рознага ўзроўню, неабавязкова заўсёды бег, ёсць і фізічныя нагрузкі. У сярэднім дзвюх гадзін хапае.

— У сваім узросце я дабіўся дастаткова добрых вынікаў. З'яўляюся майстрам спорту па лёгкай атлетыцы і па трыятлоне, таксама маю першы дарослы разрад па лыжных гонках, другі дарослы па плаванні, трэці дарослы па барацьбе. Неафіцыйна яшчэ КМС па жыме лежачы — падняў 140 кілаграмаў пры вазе 97...У кожным з відаў спорту патрабуецца шмат сіл. Але больш за ўсё мне падабаюцца лыжныя гонкі. Нідзе я не атрымліваў столькі задавальнення, як у гэтым відзе, — аддаваў усе сілы, прыходзіць ледзь жывы, не заставалася сіл паесці, але я быў задаволены і шчаслівы. Так што лыжныя гонкі для мяне — самы цяжкі від спорту, але і самы дарагі, — дзеліцца Дзяніс.

Цікаўлюся, ці плануе ён у будучыні звязаць жыццё з трэнерскай кар'ерай. Суразмоўнік адказвае, што вопыт трэнерскай працы ў яго ўжо быў, працаваў у спартыўнай школе па лёгкай атлетыцы. Але на дадзены момант як трэнер ён яшчэ не адбыўся, таму што сам яшчэ не завяршыў спартыўную кар'еру. Аднак тое, што ў яго ўсё наперадзе з трэнерскай дзейнасцю, Дзяніс у гэта верыць.

— Сакрэт майго поспеху — пастаянная праца над сабой. Заўсёды ідзіце да канца, ніколі не здавайцеся. Нават калі няма поспеху, ніколі не кідайце, бо ўсё можна выправіць.

**Анастасія КЕЙНІХ.**

*Майстар-клас*

# «Датанцавацца» да ўласнай студыі,

## ці Як адкрыць сваю справу

**Хутчэй за ўсё ці не кожнаму, хто чытае гэты матэрыял, прыходзіла ў галаву думка адкрыць сваю справу, перайсці на фрыланс і пісаць тэксты для розных заказчыкаў. Верагодна, хтосьці спалохаўся невядомасці, а нехта — маркі з дакументамі. Але мінчанін Эдуард КАЛЕСНІК ажыццявіў мару, рызыкнуўшы адкрыць... танцавальную студыю.**

Прычын для такога кроку ў суразмоўніка было дзве: мэта, якую ён сабе паставіў ужо даўно, і адсутнасць патрэбнага месца ў дзяржаўным сектары культуры і мастацтва. Таксама прыйшоў «той самы» ўзрост, калі трэба было задумацца аб сваёй будучыні.



«У 18-19 гадоў, калі ты працуеш у час вучобы і атрымліваеш нейкія грошы, табе і так добра. Але ў 22 гады ўжо надыходзіць момант, калі трэба добра падумаць пра ўласныя перспектывы. Таго, што я атрымліваў на працы, не хапала нават на мяне аднаго, а калі яшчэ трэба будзе забяспечваць сям'ю?»

Для таго каб дайсці да сваёй студыі, Эдуарду прыйшлося пераадолець дастаткова цяжкі шлях. У тыя часы, калі хлопец пачынаў «раскручвацца» ў гэтай сферы, не было такіх звыклых цяпер і папулярных платформ, як Instagram, TikTok і г. д.

«Пачыналася ўсё ледзьве не з вуліцы. Аднойчы ў санаторыі ўбачыў, як хлопец крута танцуе: стала цікава. Мы пазнаёміліся, і ён паказаў пару рухаў. Прыехаўшы дадому, я пачаў лазіць па інтэрнэце і шукаць відэаўрокі — так і вучыўся. З маім стаўленнем паралельна развіваліся і сацыяльныя сеткі, пачало з'яўляцца ўсё больш і больш танцавальных відэаматэрыялаў. Я ўсё праглядваў, выходзіў на вуліцу і трэніраваўся. Калі крыху падрос, пачаў ездзіць у Мінск на майстар-класы. Так я з самавучкі паступова пераўтвараўся ў дасведчанага танцора».

Як прызнаецца суразмоўнік, першапачаткова ён не думаў, што звяжа жыццё з танцамі. Задумаўся пра гэта, калі прыйшоў час вызначацца з ВНУ. «Злавіў сябе на думцы, што не хачу сядзець і пісаць канспекты, вучыць тэмы. Пасля такіх разваг вырашыў, што буду танцаваць».

Гучыць не так складана. Галоўнае — мець мэту, ісці да яе і па-сапраўднаму любіць сваю справу. Аднак пры афармленні ІП, на жаль, гэтага недастаткова, але і не так складана, па словах Эдуарда. Што патрабуецца для пачатку?

Першы крок — збор патрэбнага пакета дакументаў. Да яго адносяцца пашпарт, копія працоўнай кніжкі, квітанцыя аб аплаце дзяржаўнай пошліны ў памеры 0,5 базавай велічыні. Другі крок Эдуарда — наведванне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта. Тут праходзіць рэгістрацыя і выдача сертыфіката аб пацверджанні статусу ІП. Дарэчы, як расказаў суразмоўнік, працэдура займае ўсяго 15 хвілін. Трэці крок — чаканне. Цяпер зарэгістраванае ІП павінны паставіць на ўлік і прысвоіць асабісты нумар плацельшчыка. З гэтым трохі даўжэй — каля тыдня. Чацвёрты крок — падатковая інспекцыя. Тут таксама ўсё проста: варта стаць на ўлік, купіць кнігу заўваг і прапаноў і розныя бланкі — усё гэта па суме каля 20 рублёў. Пяты крок — наведванне органаў сацабароны.

Таксама Эдуард падзяліўся невялікім лайфхакам: можна яшчэ зрабіць электронны ключ, каб не ездзіць у падатковую, а проста ўсе свае справаздачы падаваць у электронным выглядзе. Галоўнае — не забываць кожны месяц высылаць справаздачу аб фінансах.

— Я працую па спрошчанай сістэме падаткаабкладання. Калі даход перавышае пэўную суму, то трэба мяняць сістэму выплаты падатку.

**Аляксандра ДОРСКАЯ.**

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

# «ТОЛЬКІ РАЗАМ І ТОЛЬКІ НАПЕРАД!»

## Першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ — аб жыццёвых прыярытэтах і выкліках часу



**«100 ідэй для Беларусі», «Валанцёр года», «Уладар вёскі», «Фермер-пачатковец», «Студэнт года», «Аднаўленне святынь Беларусі», «Сіла закона»... Усе гэтыя праекты даўно сталі візітнай карткай Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Віншуючы маладзёжную арганізацыю з яе 20-годдзем, Прэзідэнт нашай краіны адзначыў, што яна стала стартавай пляцоўкай для многіх ініцыятыў і сапраўдным сацыяльным ліфтам для юных талентаў.**

**Паўтара года таму найбуйнейшае маладзёжнае аб'яднанне краіны ўзначаліў выпускнік Камандна-інжынернага інстытута, кадравы афіцэр МНС , кандыдат тэхнічных навук Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ. Трэба заўважыць, што такому крутому павароту ў яго кар'еры папярэднічаў... праект БРСМ «100 ідэй для Беларусі», дзякуючы якому ў таленавітага хлопца з'явілася магчымасць гучна заявіць пра сябе, прычым не толькі ў Беларусі. Пасля перамогі ў конкурснай намінацыі «Хімія і нафтахімія» жыццё завіравала — яму сталі паступаць запрашэнні на іншыя конкурсы і мерапрыемствы ў Маскве, Шанхаі, Пекіне, Алматы. Аляксандр удзельнічаў у Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Сочы. Яму прапанавалі прадстаўляць БРСМ у Маладзёжнай палаце пры Парламенцкім сходзе Беларусі і Расіі. Двойчы станавіўся ўладальнікам Усебеларускай маладзёжнай прэміі «За справу»: у 2018 годзе і ў 2020-м. Сёння ён першы госць нашай новай рубрыкі «Плеяда маладых».**

### Не падвесці свайго таварыша...

***— Аляксандр, а як вы адрэагавалі на прапанову ўзначаліць Саюз моладзі? Ці доўга разважалі?***

— Спачатку за маю кандыдатуру галасавалі на галіновай выбарачнай канферэнцыі ў НДІ МНС. Прызнаюся, я чалавек амбіцыёзны, таму калі калегі прапанавалі вылучыць маю кандыдатуру на 44-м з'ездзе БРСМ, я не моцна супраціўляўся, для мяне гэта было адначасова і гонарам, і вялікай адказнасцю. Але я не меў ілюзій, ведаў, што ў нас у краіне ёсць вельмі шмат паспяховых тэрытарыяльных і галіновых арганізацый БРСМ і шмат годных кандыдатаў на пасаду першага сакратара. Але абралі ўсё ж такі мяне, і я лічу гэта вялікім авансам даверу.

З'езд БРСМ стаў той кропкай адліку, пасля якой жыццё крута змянілася: я ўсвядоміў, што на мяне ўскладзена сур'ёзная місія, і ад майго разумення пастаўленых задач і меры адказнасці залежыць будучыня тых людзей, якія мне давяраюць, і я не маю права іх падвесці. Я параўнаў бы свае адчуванні з першым маім выездам яшчэ ў якасці курсанта на пажар. Там хутка прыходзіць разуменне, што трэба не проста вырашыць пастаўленую задачу, а яшчэ і захаваць асабовы склад. Ніхто не павінен пацярпець. Ты разумееш, што калі падвядзеш свайго таварыша, калегу, то сітуацыя можа скласціся па-іншаму...

Канешне, мая цяперашняя адказнасць — не такая імгненная. Першыя вынікі мы чакаем ужо ў найбліжэйшы час, але некаторыя рэчы закладваем на гады наперад. Усё, што датычыцца моладзі, як паказалі апошнія гады, мае прынцыповае значэнне для будучыні нашай дзяржавы...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### Дапамагае спартыўны характар

***— Прафесія ратавальніка — для моцных мужчын. У вашым жыцці былі людзі, на якіх вы хацелі б раўняцца?***

— Усё ідзе з сям'і. Бацькі стараліся выхаваць мяне чалавекам, за якога ім не будзе сорамна. Я нарадзіўся ў сям'і афіцэра-ратавальніка, таму мая прафесійная будучыня была, напэўна, прадвызначана (усміхаецца. — ***Аўт.***). Я з дзяцінства памятаю пах дыму ад свайго бацькі, які вяртаўся з пажараў. Менавіта ён заразіў мяне любоўю да спорту. Зімой мы разам з ім маржавалі, абліваліся халоднай вадой, купаліся ў палонцы. Спачатку ў мяне быў шок пасля акунання ў ледзяную ваду, а потым я вельмі ганарыўся тым, што не кожны зможа гэта паўтарыць.

Я родам з Магілёва. Мы жылі каля Буйніцкага поля. І калі раніцай рабілі з бацькам прабежкі, наш шлях заўсёды пралягаў побач з мемарыялам і каменем у гонар славутага савецкага пісьменніка Канстанціна Сіманава, які апісаў легендарную бітву ў сваім рамане і завяшчаў развеяць свой прах менавіта ў гэтым месцы. Ведаеце, гэта таксама пакінула моцны адбітак.

На жаль, я быў яшчэ зусім малы, калі сышоў з жыцця мой легендарны прадзед Барыс Рыгоравіч Лук'янаў. Ён быў прызваны ў Чырвоную Армію ў 1939 годзе, удзельнічаў у савецка-фінскай вайне, потым у Вялікай Айчыннай, быў паранены пад Кёнігсбергам, затым працягнуў службу на Далёкім Усходзе. На яго лёс выпалі фактычна тры вайны. Пасля службы вярнуўся ў сваю родную вёску Пінюгі ў Быхаўскім раёне, быў бортнікам, плотнікам і, як цяпер кажуць, моцным гаспадаром. Калі ў яго цікавіліся, як яму ўдалося выжыць, прадзед казаў, што прытрымліваўся наступных традыцый. Па-першае, перад боем ён заўсёды хрысціўся (Барыс Рыгоравіч быў глыбока веруючым чалавекам), а па-другое, 100 грамаў спіртнога, якія выдавалі салдатам перад наступленнем, ён амаль ніколі не ўжываў. Казаў, што трэба было мець гарачае сэрца і халодную галаву, каб застацца жывым... Шкада, што я не змог асабіста паслухаць яго аповеды пра вайну. Адчуваю вялікі гонар за свайго легендарнага прадзеда і лічу сваім абавязкам захаваць і перадаць памяць пра яго сваім дзецям.

***— Аляксандр, але ж вы займаліся не толькі спортам, а яшчэ і танцамі... Як удавалася сумяшчаць гэтыя захапленні?***

— Чым я толькі не займаўся ў падлеткавым узросце (усміхаецца. — ***Аўт.***): і лёгкай атлетыкай, і гімнастыкай, і народнымі танцамі. Прыкладна ў 9 класе ў мяне праявіліся сур'ёзныя спартыўныя амбіцыі, я захапіўся тайландскім боксам і паралельна займаўся пажарным спортам. Вяртаўся дадому вельмі позна і ўрокі рабіў па начах. Я ніколі не пашкадаваў, што займаўся харэаграфіяй, таму што гэта дапамагае мне цяпер пераадольваць бар'еры падчас публічных выступленняў. Але спорт у выніку перамог. Я мог на кулаках адціснуцца больш разоў, чым хлопцы, старэйшыя за мяне. Я і зараз магу гэта зрабіць. Літаральна нядаўна мы сустракаліся з вучнямі 29-й сталічнай гімназіі. Разам з хлопцамі з восьмых—дзясятых класаў я выйшаў на сцэну, і мы зрабілі 60 адцісканняў.

На жаль, з-за вялікай занятасці ў маім жыцці застаецца ўсё менш месца для спорту, але спартыўны характар дапамагае ставіць мэты і дасягаць іх. Спартыўны стрыжань яшчэ і дысцыплінуе. Я разумею, што толькі асабістым прыкладам магу прапагандаваць здаровы і спартыўны лад жыцця, таму стараюся падтрымліваць сваю фізічную форму.

### Пакаленні: традыцыі і сучаснасць

***— БРСМ лічаць правапераемнікам камсамола. Але асабіста вы ўжо не засталі камсамольскіх часоў. Скажыце, а што вас аб'ядноўвае з вашымі папярэднікамі? Усё ж і краіна, і моладзь моцна змяніліся. У чым праяўляецца сувязь пакаленняў?***

— Я стараюся цікавіцца гісторыяй. Нават будынак, дзе сёння размяшчаецца Рэспубліканскі дом моладзі і дзе мы з вамі сустракаемся, літаральна працяты гісторыяй. У кіруючых органах камсамола працавала шмат людзей, якія былі ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, Героямі Сацыялістычнай Працы. Гэта славутыя сыны беларускай зямлі, якія жылі ў імя гэтай краіны, і вынікамі іх працы мы карыстаемся па сёння.

Можна па-рознаму ставіцца да камуністычнай ідэалогіі і да Савецкага Саюза, але важна, што менавіта ў гэтай дзяржаве Беларусь набыла свае цяперашнія абрысы. Мы імкнёмся адрадзіць пераемнасць паміж піянерскай арганізацыяй і БРСМ. Перафарматавалі нашу работу, адсочваем фарміраванне маладога чалавека на ўсіх этапах, і цяпер з піянераў у БРСМ пераходзяць ужо не 50 працэнтаў, а больш за 80 працэнтаў падлеткаў. Мы іх адразу падхопліваем, бяром пад сваё крыло. Падчас святкавання 20-годдзя ўтварэння БРСМ у парку Марата Казея ў Мінску мы прэзентавалі новую цырымонію пераемнасці — развітанне з піянерскім гальштукам.

Для моладзі савецкіх часоў быў уласцівы калектывісцкі дух. Мы таксама да гэтага імкнёмся. Аднавілі дзейнасць студатрадаў. Для таго, каб студатрадаўскі рух быў менавіта рухам, сістэмным, са сваімі традыцыямі (а мы бяром за ўзор камсамольскія студэнцкія атрады), прадумваем яго ідэалогію, працуем над сімволікай, атрыбутыкай, пішам песні. На мой погляд, калектывісцкія каштоўнасці знаходзяць водгук у сучасных маладых людзей. У многія студатрады нават утвараецца конкурс. Студатрадаўскі рух перадае традыцыі дзелавых і чалавечых адносін, фарміруе сапраўдных патрыётаў сваёй краіны, якія становяцца датычнымі да навейшай гісторыі незалежнай Беларусі.

Але мы пайшлі наперад. Укараняем новыя традыцыі. І пераходны сцяг па выніках трэцяга працоўнага семестра ўручаем цяпер ужо не толькі найлепшаму атраду, але і найлепшаму наймальніку. Сцяг цэлы год нагадвае, як добра ўсе разам папрацавалі, а для астатніх арганізацый, якія прымаюць студатрады, гэта прыклад і добры матыватар.

***— А як бы вы сфармулявалі місію арганізацыі, якую ўзначальваеце, сёння?***

— Мы бачым сваю задачу не толькі ў стварэнні ўмоў для ўсебаковага развіцця моладзі і яе самарэалізацыі, але і ў захаванні памяці да нашага культурнага і гістарычнага мінулага. У захаванні генетычнага кода беларусаў, бо ў глабальным свеце, пры магутным уплыве сацыяльных сетак дастаткова складана захаваць сваю самаідэнтычнасць. Год гістарычнай памяці яскрава паказаў, што акрамя Вялікай Айчыннай вайны, якая закранула літаральна кожную беларускую сям'ю, ёсць яшчэ шмат гістарычных падзей, на якія абапіраецца беларуская дзяржаўнасць. І наша місія — адчыніць маладому пакаленню ўсе дзверы, дапамагчы самаідэнтыфікаваць сябе ў гэтым стракатым свеце менавіта як беларуса, як чалавека, гатовага ўзяць адказнасць за будучыню сваёй краіны. Гістарычная памяць патрабуецца не столькі дарослым, колькі маладым... Мы павінны садзейнічаць выхаванню моладзі на аснове патрыятычных і духоўна-маральных каштоўнасцяў.

Вельмі важна разумець, якая гістарычная місія ўскладзена на сённяшняе пакаленне маладых людзей: не згубіць патэнцыял, захаваць дынаміку, умацаваць нашу краіну. Мы глядзім у будучыню і дакладна бачым канфігурацыю грамадзянскай супольнасці з апорай на моладзь у якасці Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

Не думаю, што сэнс, які мы ўкладаем у паняцце «быць патрыётам», змяніўся. І раней, і сёння быць патрыётам азначае суадносіць уласныя інтарэсы і інтарэсы беларускай дзяржавы.

### Захаванне гістарычнай памяці

***— У час Паслання кіраўніка дзяржавы народу і парламенту Саюз моладзі выступіў з ініцыятывай аб наданні рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Хатынь» статусу Усебеларускай маладзёжнай будоўлі. Падзяліцеся, што было зроблена актывістамі вашай арганізацыі на гэтым аб'екце?***

— З красавіка і па сёння ў работах па рамонце і рэканструкцыі аб'ектаў мемарыяльнага комплексу «Хатынь» прынялі ўдзел больш як 1600 чалавек: гэта актывісты БРСМ, у тым ліку Цэнтральнага апарата, байцы будаўнічых і педагагічных атрадаў з усіх рэгіёнаў краіны, работнікі МАЗа, «Бел-Джы», Беларускага металургічнага завода, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, міністэрстваў, Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе, члены Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Беларускага саюза жанчын, Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, хакейнай зборнай каманды Прэзідэнта, слухачы БДУ з М'янмы, грамадзяне Германіі, міжнародны атрад валанцёраў з Пскоўскай вобласці і Латвійскай Рэспублікі «Хатынь-2022». Пра што гэта сведчыць? Пакуль недзе перапісваюць гісторыю і знішчаюць гістарычную памяць, мы даём магчымасць далучыцца да яе захавання маладым людзям з іншых дзяржаў. Беларусь з'яўляецца фарпостам захавання аб'ектыўнай гістарычнай памяці.

Кіраўніцтва краіны аказала нам высокі давер, даручыўшы выканаць задачу па абнаўленні мемарыяльнага комплексу. І мы разам з Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам шчыравалі на суботніку. Вядома, размова не ідзе аб будоўлі дзеля будоўлі. Перш за ўсё тут прысутнічае выхаваўчы момант. Маладыя людзі, якія абнаўляюць манумент і ўносяць свой уклад, становяцца часткай гісторыі. Гэта падзея застанецца з імі на ўсё жыццё, і яны з гонарам будуць расказваць пра яе сваім дзецям.

У нас ёсць думка зрабіць такую працу ў дачыненні да гістарычных аб'ектаў сістэмнай... Калі, напрыклад, будуць узводзіць на Буйніцкім полі музей, моладзь павінна быць і там.

### Валанцёрства і прававая асвета

***— А наколькі далёка ўдалося прасунуцца ў развіцці валанцёрства?***

— Валанцёрскі рух БРСМ «Добрае Сэрца» стаў паўнапраўным партнёрам дзяржавы ў вырашэнні сацыяльных праблем і задач. Яго візітнымі карткамі з'яўляюцца дабрачынны марафон «Усе фарбы жыцця для цябе», дабрачынная акцыя «У школу з добрым сэрцам», «Дзень абароны дзяцей з БРСМ», праект «Мы выбіраем дапамогу пажылым людзям». У гэтым годзе будзем адзначаць ужо дзесяцігоддзе Міжканфесійнага дабрачыннага праекта «Аднаўленне святынь Беларусі». У Год гістарычнай памяці ў праекце прынялі ўдзел 3600 валанцёраў руху «Добрае Сэрца». Пад слоганам «Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера» маладыя людзі добраўпарадкавалі 274 святыні.

У валанцёраў «Добрага Сэрца» ёсць «уласны твар»: свой лагатып і гімн руху. Ёсць дакладна выбудаваная структура, якая аб'ядноўвае больш як 1900 атрадаў: гэта школьная, студэнцкая і працоўная моладзь. Валанцёрскі рух ахоплівае больш за 33 тысячы хлопцаў і дзяўчат. Дзякуючы сваёй структуры, мы можам у кароткія тэрміны аператыўна рэагаваць на сацыяльныя выклікі, можам арганізаваць работу валанцёраў па любой праблематыцы: ковід, расчыстка снегу, нарыхтоўка дроў, дапамога бежанцам...

У мінулым годзе напрамкі валанцёрскай дзейнасці БРСМ пашырыліся: акрамя сацыяльнага, працоўнага, экалагічнага і спартыўнага валанцёрства ў нас з'явіліся два новыя адгалінаванні дзейнасці — валанцёрства заалагічнае і культурна-патрыятычнае, у тым ліку археалагічнае. У жніўні мінулага года мы разам з Саветам маладых вучоных НАН рэалізавалі археалагічны праект — валанцёры разам з навукоўцамі ўдзельнічалі ў раскопках на гарадзішчы на рацэ Менцы — там, дзе, як мяркуецца, размяшчаўся далетапісны Мінск. Мы заключылі пагадненне з Інстытутам гісторыі НАН, каб і надалей рэалізоўваць падобныя сумесныя праекты. Гэта ўжо не проста валанцёрства, а яшчэ і патрыятычнае выхаванне моладзі, далучэнне яе да гісторыі...

***— Нядаўна ўся краіна абмяркоўвала законапраекты аб Усебеларускім народным сходзе і змены ў Выбарчым кодэксе. БРСМ таксама не застаўся ўбаку, арганізоўваў дыялогавыя пляцоўкі «Сіла закона». Як вы лічыце, беларуская моладзь цікавіцца палітыкай? Наколькі эфектыўныя маладзёжныя дыялогавыя пляцоўкі?***

— Прававое выхаванне — гэта новы, але вельмі важны напрамак, прапісаны ў стратэгіі развіцця нашай арганізацыі. Часта моладзь ведае свае правы, але не ведае сваіх абавязкаў. Сёння мы выхоўваем прававую культуру ў маладых грамадзян. Як той казаў, папярэджаны — значыць, узброены. І моладзь зацікаўлена ў прававой асвеце. Напрыканцы года прайшоў фінал другога прававога турніру «Сіла закона». У праекце прынялі ўдзел 25,6 тысячы старшакласнікаў. У параўнанні з першым турнірам на 9 тысяч больш. Вельмі важна, калі нашы школьнікі ўжо з'яўляюцца экспертамі ў сваіх узроставых катэгорыях у плане ведання асноў Канстытуцыі,

Колькасць удзельнікаў турніру расце, пашыраецца іх геаграфія, павышаецца ўзровень ведаў і падрыхтоўкі канкурсантаў. І гэта не з'яўляецца для нас нейкім адкрыццём. У ходзе шырокамаштабнай работы па абмеркаванні праекта Канстытуцыі Беларусі на дыялогавых пляцоўках і праекта закона аб Усебеларускім народным сходзе моладзь, старшакласнікі — навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі — былі ў авангардзе. Яны па-сапраўднаму актыўныя, ад іх паступіў шэраг канкрэтных і канструктыўных прапаноў па дадзеных пытаннях.

Абмяркоўваючы на адкрытых дыялогах закон аб Усебеларускім народным сходзе, маладыя людзі разумеюць, што ўмовы, створаныя для іх рэалізацыі, маюць цалкам прадметны характар. І самае папулярнае пытанне, якое задае моладзь падчас такіх абмеркаванняў «Як стаць дэлегатам УНС?». Маладых цікавіць, і як можна стаць дэпутатам, каб удзельнічаць у заканатворчай дзейнасці. Гэта здаровыя канструктыўныя палітычныя амбіцыі. Моладзь павінна мець не толькі магчымасць абмяркоўваць, але і быць удзельнікамі такога ўнікальнага фарміравання, як Усебеларускі народны сход. Зараз адбываецца змена пакаленняў, змена кіраўнікоў арганізацый, прадпрыемстваў, навуковых школ. І трэба ўсім цікавіцца, каб не застацца за бортам.

А мы падчас дыялогаў атрымліваем зваротную сувязь. Аналізуем пытанні, якія агучвае моладзь, і такім чынам выбудоўваем вектар працы не толькі БРСМ, але і ўсёй маладзёжнай палітыкі. Вельмі хочацца падзякаваць актыўным і неабыякавым маладым людзям, якія ўдзельнічаюць у абмеркаванні вельмі прафесійна. Адчуваецца, што, верагодна, яны атрымліваюць юрыдычную адукацыю або вельмі сур'ёзна паглыбленыя ў гэтыя пытанні. Ім цікава, як будзе развівацца краіна, і яны жадаюць, каб былі захаваныя стабільнасць і пераемнасць.

***— Падчас нашай першай сустрэчы адразу пасля вашага абрання на пасаду першага сакратара ЦК БРСМ мы з вамі разважалі аб тым, якім жа павінен быць маладзёжны лідар, што стаць ім у пераломны час — сур'ёзная адказнасць. Скажыце, ці ўдаецца вам знайсці агульную мову з усімі? Вы падзяляеце моладзь на сяброў БРСМ і тых, хто не мае членскага білета?***

— На сваіх і чужых мы моладзь не падзяляем, а працуем з усімі. Арганізацыя павінна стаць цікавай, каб малады чалавек да яе далучыўся. Бывае, маладым людзям цікавая наша праектная дзейнасць, яны жадаюць стаць часткай праекта і часткай каманды, але пры гэтым не з'яўляюцца членамі Саюза моладзі. Калі ласка, далучайцеся. Мы адкрытыя для ўсіх. Прымушаць і выкарыстоўваць адміністрацыйныя метады, каб павялічыць працэнт ахопу моладзі членствам у БРСМ, — не наша гісторыя. У доўгатэрміновай перспектыве, на якую мы працуем, такія метады нічога добрага не прынясуць. Лічу, што калі ты сам верыш у тое, што робіш, то заражаеш сваёй верай іншых. Тыя хлопцы і дзяўчаты, якія не знайшлі сваё месца ў арганізацыі, гэта нашы кропкі для росту. Трэба думаць, куды нам трэба яшчэ развівацца, каб быць цікавымі для ўсіх.

Мы праводзім канструктыўную палітыку, накіраваную на тое, каб арганізацыя была апорай, дапамагала вырашаць канкрэтныя праблемы, і мы рады, што, паводле апошняга сацыялагічнага даследавання, дзейнасць БРСМ атаясамляецца ў моладзі ўжо не толькі з культурна-масавымі мерапрыемствамі, якія таксама важныя, але і з валанцёрскай дзейнасцю, з арганізацыяй другаснай занятасці моладзі.

### Заўсёды на сувязі

***— А як выглядае звычайны дзень лідара самай буйной маладзёжнай грамадскай арганізацыі? Вы можаце дазволіць сабе адключыць тэлефон, каб пабыць з сям'ёй?***

— Нягледзячы на тое, што апошнія паўтара года цалкам паглыбіўся ў грамадскую работу, я застаюся бацькам для сваёй дачкі і дзіцём для сваіх бацькоў, якія з'яўляюцца і маімі балельшчыкамі, і маімі крытыкамі. Мой рабочы дзень можа распачацца вельмі рана і скончыцца вельмі позна. І я нават не заўсёды ведаю, дзе магу апынуцца цягам дня. Водпуску ў мяне фактычна не было. Таму я вельмі ўдзячны сваёй мудрай жонцы, гэта мой самы дарагі чалавек, якая дапамагае мне не выпасці з жыцця дзіцяці. Дзесьці ў нейкіх паездках яны мяне суправаджаюць. Раніцай я стараюся асабіста адвесці дачку ў школу. Яна ў мяне першакласніца. А вось адключыць свой тэлефон не магу. У мяне адкрыты ўсе акаўнты ва ўсіх сацыяльных сетках і месенджарах. Я не магу закрыцца ад людзей. Гэта было б дзіўным. Магу толькі дазволіць сабе не адрэагаваць імгненна на штосьці, што можа пачакаць. Але пазней я абавязкова адкажу.

***— Аляксандр, вы навучаліся ў ВНУ Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. А ці хапае вам атрыманых ведаў на цяперашняй рабоце?***

— Яшчэ падчас навучання ў Камандна-інжынерным інстытуце я захапіўся навукай. Абараніў кандыдацкую па тэме «Вогнетрываласць поліэфірных матэрыялаў». Выкладаў, займаў пасаду начальніка аддзела даследаванняў у галіне ліквідацыі надзвычайных сітуацый Навукова-даследчага інстытута пажарнай бяспекі і праблем надзвычайных сітуацый МНС. Але цудоўна разумею, што трэба развівацца пастаянна. Што ўсе адкрыцці робяцца зараз на стыку навук у міждысцыплінарных камандах. Разумею, як важна ведаць гісторыю, і ў стратэгіі развіцця нашай арганізацыі трэба абапірацца менавіта на яе. Вельмі хацелася б заразіць захапленнем гісторыяй усю беларускую моладзь. А зараз я навучаюся ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь на спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і ідэалогія». Зноў стаў студэнтам. Шчыра скажу: гэта новы цікавы вопыт...

***— А ці ёсць у вас жыццёвае крэда або нейкі выраз, які адлюстроўвае вашы прынцыпы па жыцці?***

— Гэту фразу неаднойчы паўтараў кіраўнік нашай дзяржавы. І мы ў рамках ўзаемадзеяння з піянерскай арганізацыяй заклалі яе ў аснову ўрачыстага абяцання, якое будуць даваць піянеры, уступаючы ў БРСМ: «Толькі разам і толькі наперад!».

**Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*Тэкст цалкам і больш фота глядзіце на zviazda.by*

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 9 февраля 2023 г. на 3-м открытом аукционе проводит 24-й от 28 декабря 2022 г. повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 247 | Грузовой (цистерна) KAMAZ 43118, кузов (рама) № X6736242750000005, XTC43118R52253130, рег. № АА 2817-7, 2005 г., пробег 97500 км | г. Минск, ул. Козлова, 26 | 20 000,00 | 4 000,00 |
| 249 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К1-131 в составе: кузов-фургон К1-131 № 10507, 1976 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131, ш. 227348, дв. 249577, 1976 г., 3 кат., 1956 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 250 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К1-131 в составе: кузов-фургон К1-131 № 12593, 1983 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 568488, дв. 050214, 1983 г., 3 кат., 1080 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 251 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К1-131 в составе: кузов-фургон К1-131 № 01201, 1986 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 676893, дв. 567504, 1986 г., 3 кат., 558 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 550,00 | 1 710,00 |
| 252 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К2-131 в составе: кузов-фургон К2-131 № 03362, 1983 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 529376, дв. 855438, 1983 г., 3 кат., 1082 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 550,00 | 1 710,00 |
| 253 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131 № 0590, 1981 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 442777, дв. 405328, 1981 г., 3 кат., 1349 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 254 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131 № 07843, 1986 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 704595, дв. 699068, 1986 г., 3 кат., 1107 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 255 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131 № 04262, 1977 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 261443, дв. 441263, 1977 г., 3 кат., 1503 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 256 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КУНГ-1М в составе: кузов-фургон КУНГ-1М № б/н-614580, 1981 г., 4 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 429546, дв. 337921, 1981 г., 3 кат., 1324 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 6 600,00 | 1 320,00 |
| 257 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КФ-1 в составе: кузов-фургон КФ-1 № 37209, 1989 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131, ш. 837209, дв. 319434, 1989 г., 3 кат., 3937 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 6 900,00 | 1 380,00 |
| 258 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № 200982, 1982 г., 2 кат., автошасси ГАЗ-66 ш. 0306745, дв. 199962, 1982 г., 3 кат., 1000 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 6 000,00 | 1 200,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **9 февраля 2023 г. в 10.00**.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 6 февраля 2023 г.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **9 февраля 2023 г. с 9.15 до 10.00.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000,
российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс: (017) 319-35-41, +375 (44) 583-77-45. Электронная почта: **auk@bsk.by.**

Извещение опубликовано на сайте **http://www.gki.gov.by/ru и https://bsk.by.**

## Извещение о проведении **31 января 2023 года** повторных торгов с условиями по продаже жилых помещений (квартир) и машино-мест, принадлежащих ОАО «Минский домостроительный комбинат»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | Квартира по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-5 (2-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 67,4 кв. м, общая площадь по СНБ – 70,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812536); машино-место по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-106 (1-й подземный этаж, площадь – 17,5 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812780) | 205 091,43 | 5 000,00 |
| 2 | Квартира по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-48 (1-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 65,4 кв. м, общая площадь по СНБ – 68,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812579); машино-место по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-151 (1-й подземный этаж, площадь – 17,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812825) | 204 666,95 | 5 000,00 |
| 3 | Квартира по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-69 (6-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 63,5 кв. м, общая площадь по СНБ – 66,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812600); машино-место по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-164 (1-й подземный этаж, площадь – 16,4 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812838) | 192 087,56 | 5 000,00 |
| 4 | Квартира по адресу: г. Минск, ул. Неманская, 25-202 (3-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 77,5 кв. м, общая площадь по СНБ – 80,7 кв. м, инвентарный номер 500/D-707998017) | 184 701,25 | 5 000,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минский домостроительный комбинат», ул. Пономаренко, 43, 220015, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. Карла Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:**

1. победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

2. расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский домостроительный комбинат», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток по соответствующему предмету торгов и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), а также представившие организатору торгов следующие документы:

У такой сітуацыі падаўжэнне бязвізавага рэжыму на 2023 год стала выхадам для многіх грамадзян еўрапейскіх краін, якія жадаюць купляць прадукты харчавання па прымальных цэнах. Нагадаем, прапанову аб працягу бязвізу для жыхароў Літвы, Латвіі і Польшчы падтрымаў Прэзідэнт Беларусі. Па словах польскага палітолага Томаша Янкоўскага, узровень інфляцыі ў Польшчы дасягае крытычных паказчыкаў, таму для жыхароў гэтай краіны магчымасць прыехаць у нашу краіну стала выдатным падарункам. «Я магу за гэта толькі падзякаваць Прэзідэнту Лукашэнку, таму што ён проста не глядзеў, што робяць улады ў нашых дзяржавах, у Польшчы і ў Прыбалтыцы, у адносінах да Беларусі. Проста хоча, каб нашы людзі даведаліся праўду пра Беларусь. Справа ў тым, што ніякага адказу з боку нашых улад не будзе, а калі будзе, то мы ўбачылі адказ, як нашы ўлады толькі палохалі палякаў не ехаць у Беларусь. У нас вельмі вялікая праблема з інфляцыяй, таму можна ехаць проста па пакупкі ў Беларусь, — адзначыў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» Томаш Янкоўскі. — У вас на 30 працэнтаў таннейшае ўсё, калі кажам пра звычайныя прадукты, якія купляем у крамах, а яшчэ, можа быць, і рост розніцы ў цэнах, таму што ў нас інфляцыя».

Тым часам стала вядома, што ўлады Польшчы ў 2023 годзе выдаткуюць на абарону каля 21 мільярда долараў. Яшчэ да 8,5 мільярда пойдуць у пазабюджэтны фонд для закупак узбраення за мяжой. На фоне фактычнага падзення ваеннага бюджэту прэзідэнт Польшчы Анджэй Дуда падпісаў папраўку да закона, якая датычыцца медыцынскага забеспячэння палякаў. Сёлета Міністэрства аховы здароўя атрымае на тры мільярды долараў менш, чым у 2022-м. Вось і ўся «арыфметыка» польскіх улад, якія проста не дбаюць пра людзей.

**Пётр ДУНЬКО.**

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В.П. извещает о проведении 27 января 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % (лот № 2); на 75 % (лоты №№ 1, 4, 5) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи: по лотам №№ 1, 2, 5:** затраты по переоформлению документов на переход права собственности возлагаются на Покупателя. **По лоту № 4:** действия по снятию с регистрационного учета транспортного средства, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем за его счет и его силами на основании доверенности, выданной Продавцом. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет Покупателя | | | |
| **ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА СО СНИЖЕНИЕМ НА 75 % (лоты №№ 1–105 (автозапчасти) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»** | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-81185**, общей площадью **3 264,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **Капитальное строение с инв. № 350/С-167549**, общей площадью **7,7** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное (проходная). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006414,** общей площадью **0,2036 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (лот № 1) размещен на сайте Организатора торгов www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»** | 479 791,80 | **47 979,18** |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-169247**, общей площадью **248,3** кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006415,** общей площадью **0,0395 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/3. Сооружение – часть дворового покрытия, инв. № 01361031 (площадью 121,0 кв. м) | 23 310,96 | **2 331,10** |
| 4 | Автомобиль GAZ-3110, рег. № 2880 ЕМ-3, 2000 г. в., тип – легковой седан, МКПП, тип двигателя – бензиновый, пробег – 265 039 км, состояние – неудовлетворительное | 240,00 | **24,00** |
| 5 | Сооружение – часть дворового покрытия, инв. № 01361031 (площадью 409,0 кв. м) | 15 466,97 | **1 546,70** |

**Продавец:** коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 647-81-95, Сакович Вадим Павлович.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 января 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 25 января 2023 г. в 16.00 включительно.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 10.06.2022 г. № 112 (29734), от 09.06.2022 г. № 111 (29733).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы», на сайте www.gomel-region.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 27 января 2023 года аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 347-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)**

| № предмета аукциона | Арендодатель имущества | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.) | Наименование и целевое использование имущества |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 99 | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, тел. +375 (163) 49 56 01 | **Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Труханова, д. 12В** | 17,40 | 3,0 | 73,52 | Помещения под размещение сотрудников (офиса), организация розничной торговли. **Срок аренды – 3 года** |
| 100 | | **Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Труханова, д. 12В** | 10,60 | 3,0 | 44,79 | Помещения под размещение сотрудников (офиса), организация розничной торговли. **Срок аренды – 3 года** |
| 101 | | **Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Труханова, д. 12В** | 14,00 | 3,0 | 59,15 | Помещения под размещение сотрудников (офиса), организация розничной торговли. **Срок аренды – 3 года** |
| 102 | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, тел. +375 (163) 49-53-04 | **Брестская обл., Лунинецкий р-н, г. Лунинец, ул. Вокзальная, 6/6** | 28,10 | 1,0 | 118,72 | Помещение под организацию розничной торговли, размещение сотрудников, оказание услуг, размещение склада. **Срок аренды – 3 года** |
| 103 | ГУО «Центр повышения квалификации руководящих работников и специалистов «Белдорстрой», тел. +375 17 259 86 15 | **г. Минск, ул. Кальварийская, 37/1** | 2,00 | 3,0 | 8,50 | Часть холла под размещение вендингового кофейного аппарата. **Срок аренды – 1 год** |
| 104 | РУП «Президент-Отель», тел. 8017 229 71 10, 8017 229 70 38, 8029 566 58 98 | **г. Минск, ул. Кирова, 18-601** | 300,40 | 2,0 | 1 269,19 | Встроенное помещение для оказания услуг по организации отдыха и развлечений, общественного питания, розничной торговли. **Срок аренды – 3 года** |
| 105 | УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский, тел.: 8017 2256121, 8017 2256977 | **г. Минск, ул. Вокзальная, 26В** | 11,50 | 23,0 БАВ (388 руб. 70 коп.) | 97,18 | Площадь для организации розничной торговли продовольственной группой товаров. **Срок аренды – 3 года** |
| 106 | РУП «Белстройцентр», тел.: 8017 317 12 16, 8017 270 22 91 | **г. Минск, ул. Притыцкого, 87-232** | 17,80 | 7,1 БАВ | 75,21 | Подземный этаж под хранение транспортного средства. **Срок аренды – 3 года** |
| 107 | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, тел. +375 163 495601 | **г. Гродно, ул. Будённого, 37** | 33,60 | 2,0 | 141,96 | Помещения под размещение склада, офиса, оказание услуг (за исключением п.1.4.1 Приложения 2 к Положению, утв. Указом Президента РБ от 29.03.2012 №150), розничная торговля. **Срок аренды – 3 года** |
| 108 | | **г. Гродно, ул. Будённого, 37** | 73,90 | 2,0 | 312,23 | Помещения под размещение склада, офиса, оказание услуг (за исключением п.1.4.1 Приложения 2 к Положению, утв. Указом Президента РБ от 29.03.2012 № 150), розничная торговля. **Срок аренды – 3 года** |
| Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10. Аукцион состоится **27 января 2023 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 6 января 2023 г. по 23 января 2023 г.** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционе **№ 347 от 27.01.2023** по предмету аукциона № ___. | | | | | | |
| Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). Телефон для справок +375 (17) 360 42 22 | | | | | | |

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении открытого повторного аукциона по продаже жилого помещения государственного жилищного фонда –**

## ТРЕХКОМНАТНОЙ КВАРТИРЫ,

**находящейся в собственности Гомельского республиканского унитарного предприятия электроэнергетики «Гомельэнерго» (РУП «ГОМЕЛЬЭНЕРГО») – (далее – ПРОДАВЕЦ)**

**Дата и время проведения аукциона: 26 января 2023 года в 11.00.**

**Место проведения: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга»**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** претендент (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет после заключения и регистрации договора купли-продажи вправе обратиться за выделением и регистрацией земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона в органы государственной регистрации, а также дополнительно возмещает расходы продавцу по предпродажной подготовке | | | |
| 1 | **Квартира № 1, инв. № 311/D-11806 в блокированном жилом доме**, назначение – квартира, наименование – квартира № 1. Адрес: Гомельская обл., Ветковский р-н, Даниловичский с/с, аг. Даниловичи, ул. Советская, 14-1. Состоит из 1/2 части кирпичного жилого дома с двумя верандами, с надворными постройками: уборной, сараем. Общая площадь 51,5 кв. м, жилая площадь 33,8. Число комнат: 3 | **31 845,65** | **636,91** |

**ПРОДАВЕЦ:** Гомельское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Гомельэнерго» (РУП «ГОМЕЛЬЭНЕРГО»). 246001, г. Гомель, ул. Фрунзе, 9.

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел. **8 (02330) 26441 – Асютин Михаил Сергеевич.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Желающее принять участие в аукционе лично либо через своего представителя в установленный в извещении срок обязаны:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204 назначение платежа – задаток за участие в аукционе 26.01.2023г. по лоту № 1.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов **с 12 января 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 24 января 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. **Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней** после утверждения протокола о результатах аукциона возместить Организатору затраты на организацию и проведение аукциона, об утвержденной сумме которых уведомляется до начала аукциона; представить копии платежных документов, подтверждающих их возмещение; подписать с Продавцом договор купли-продажи жилого помещения **в течение 12 (двенадцати) рабочих дней** после утверждения протокола о результатах аукциона. **Продавец предоставляет рассрочку оплаты жилого помещения на 3 (три) года. Условие оплаты предмета аукциона – выплатить Продавцу стоимость предмета аукциона, сформированную в установленном порядке равными долями в течение 36 месяцев (согласно договору купли-продажи).** В случае отказа (уклонения) победителя аукциона от подписания протокола о результатах аукциона, и (или) договора купли-продажи жилого помещения, а также от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона внесенный им задаток возврату не подлежит. При уклонении одной из сторон от подписания договора купли-продажи жилого помещения другая сторона вправе обратиться в суд с требованием о понуждении заключить договор, а также о возмещении убытков, причиненных уклонением от его подписания. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 16.11.2022 г. № 225 (29847).**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи жилых помещений государственного жилищного фонда на аукционе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 17 ноября 2010 г. № 1695.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**

организатор торгов по продаже имущества Бобруйское ОАО «Агромашсервис» (УНП 700003471), объявляет о проведении **26.01.2023 г.** в 09.00 электронных торгов на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2023/01/spisok-imushhestva-agromashservis-1.pdf**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375 44 7485256.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ по лоту № 1 – 600,00 бел. руб. по лоту № 2 – 120,00 бел. руб., публикация в СМИ по лоту № 1 – 500,11 бел. руб., стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре, за оценку по лоту № 1 – 350,00 бел. руб., по лоту № 2 – 300,00 бел. руб., аукционный сбор по лоту № 1 – **5 %** от цены реализации имущества без учета НДС (НДС 20 %), по лоту № 2 – **7 %** от цены реализации имущества без учета НДС (НДС 20 %).

Дополнительные условия: по лоту № 2 – в жилых помещениях зарегистрированы по месту жительства физические лица, которые подлежат к снятию с регистрационного учета при смене собственника.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 7 рабочих дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 календарных дней с даты проведения торгов.

# КЛОПАТУ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

## Чаму важна больш увагі ўдзяляць людзям сталага ўзросту

**У краіне ўпершыню падчас калядных свят праходзіць дабрачынная акцыя «Ад усёй душы». Яе сэнс у тым, каб парадаваць адзінокіх жыхароў сталага веку падарункамі. Толькі Гродзенская абласная арганізацыя БРСМ наведала звыш ста чалавек. Асабліва цікавай аказалася сустрэча з ветэранам студатрадаўскага руху, педагогам з амаль 60-гадовым стажам Ірынай ЕНДЖЭЕЎСКАЙ.**



Прадстаўнікі абласнога камітэта БРСМ пабывалі ў гасцях у знакамітай гродзенкі. А вось дзеля сустрэчы з карэспандэнтам «Звязды» Ірына Ільінічна сама завітала да сваіх маладых шэфаў, захапіўшы важныя для яе атрыбуты.

У першую чаргу жанчына дэманструе белую парадную «байцоўку» з мноствам значкоў і медалёў. Аказваецца, курткы больш за 35 гадоў, і яна даволі добра сядзіць на сваёй гаспадыні — якраз па фігуры. І хоць Ірыне Ільінічне 81 год, некаторыя значкі захоўваюцца з яе піянерскага і камсамольскага ўзросту. Нямала ганаровых званняў, ветэранскіх і памятных медалёў, у тым ліку расійскіх.



Трыццаць гадоў запар жанчына з'яўлялася камандзірам студэнцкага атрада «Беларусь», які выязджаў на работу ў Краснадарскі і Стаўрапольскі край, Астраханскую вобласць Расіі. Кажа, што беларусаў там вельмі любілі. І не толькі таму, што яны добрасумленна і адказна выконвалі свае рабочыя абавязкі. У складзе атрада было нямала навучэнцаў каледжа мастацтваў, дзе працавала і сама Ірына Енджэеўская. Пасля работы ці ў выхадныя дні для мясцовага насельніцтва ладзілі канцэртную праграму.

> **Для маладых такія аповеды карысныя. Без узаемадзеяння са старэйшым пакаленнем нельга выхаваць здаровую нацыю, без набыткаў мінулых гадоў чалавек наўрад ці стане патрыётам сваёй краіны, лічыць прадстаўнік БРСМ. Вось чаму маладыя валанцёры з вялікім натхненнем уключыліся ў акцыю «Ад усёй душы».**

У ходзе гутаркі ўспомніўся і першы яе выезд у складзе студэнцкага атрада. Яны працавалі на прапольцы буракоў у калгасе. Цяпер на гэтым месцы знаходзіцца папулярны аб'ект — аграрыстычны комплекс «Каробчыцы». Даводзілася і лён сярпамі ўбіраць — да гэтага часу памятае блакітнае поле. А завяршылася студатрадаўская кар'ера на мясцовым кансервавым заводзе ў 2016 годзе ва ўзросце 75 гадоў!

Свой аповед гаспадыня падмацоўвае шматлікім архівам — альбомамі з фотаздымкамі і цэлым стосам ганаровых грамат. Здаецца, гэта старонка яе жыцця засталася ў мінулым, але жанчына так не лічыць. Кажа, што так і не змагла выйсці з гэтага руху — паранейшаму імкнецца жыць маладзёжнымі клопатамі. У камітэце БРСМ яе лічаць сваім надзейным памочнікам.

Ірына Ільінічна — пастаянны ўдзельнік многіх мерапрыемстваў, адкрытых дыялогаў, сустрэч пакаленняў. Днямі пабачыцца са школьнікамі роднай школы.

Вядома, жанчына прыгадае сваю багатую студатрадаўскую біяграфію. І тое, як яе атрад узяў шэфства над сям'ёй воіна-інтэрнацыяналіста з Гродзенскага раёна. Хлопец быў адзіны сын у сям'і, загінуў у Афганістане літаральна за тыдзень да дэмабілізацыі. Студэнты дапамаглі яго бацькам з пераездам у Гродна, зрабілі ў доме рамонт. Асірацелыя бацькі нават хацелі ўсынавіць аднаго з членаў студатрада, які быў падобны на іх сына. Доўгі час атрад не губляў сувязі з імі, заўсёды адгукаўся на просьбы.

— Моладзі трэба ведаць, праз што прайшла наша Беларусь, перш чым яна стала моцнай і незалежнай. Гэта вялікае шчасце — жыць у краіне, якая захоўвае сваю гісторыю і гадуе дзяцей у павазе да міру і згоды. Не для кагосьці, а для сябе. Гэта важней за ўсё. І вельмі добра, што нашы маладзёжныя арганізацыі запрашаюць на сустрэчы пакаленняў людзей, якім ёсць што расказаць, — лічыць суразмоўніца.

У сучаснай моладзі вялікі патэнцыял, кажа яна. Магчыма, цяперашні час больш прагматычны, затое зараз шмат магчымасцяў рэалізаваць свае планы. Ірына Ільінічна вельмі высока ацэньвае праект БРСМ «Сто ідэй для Беларусі». Моладзь прапануе праекты ў розных сферах нашага жыцця. Яны маюць практычную накіраванасць. «Думаю, гэты праект варта працягваць і надалей, даваць магчымасць раскрываць таленты як мага большаму колу маладых людзей», — упэўнена жанчына.

Яе энергіі можна пазайздросціць. Амаль штодзень Ірына Ільінічна прысвячае шматлікім грамадскім справам. Нікому не адмаўляе ў сустрэчы. Лічыць сваім абавязкам прадаўжаць трывалы мосцік паміж пакаленнямі. Але і сапраўднай жанчыне патрэбны клопат і ўвага. Аб гэтым сведчыць радасць, з якой ветэран студатрадаўскага руху сустрэла маладых шэфаў.

Як зазначыла **другі сакратар абласнога камітэта БРСМ Наталля СТАНЮКЕВІЧ,** валанцёры не забываюць сваіх актывістаў, бо гэта добры стымул для іх дзейнасці, свайго кшталту крыніца энергіі. Такія людзі — каштоўны капітал. Ім заўсёды ёсць што сказаць маладым, яны ніколі не адмаўляюцца ад удзелу ў розных мерапрыемствах. Багаты архіў, які назапашаны ў Ірыны Енджэеўскай, стане часткай экспазіцыі новага музея, прысвечанага камсамолу і сучаснаму маладзёжнаму руху.

На думку Наталлі, важна, каб прадстаўнікі старэйшага пакалення, якія могуць служыць прыкладам для моладзі, таксама ведалі, што побач заўсёды ёсць падтрымка.

— У нас нямала акцый, якія скіраваны на сталых людзей, на ветэранаў і адзінокіх, дапамагаем ім, віншуем з юбілейнымі датамі. Некаторыя раёны актыўна падтрымліваюць людзей паважанага ўзросту, але такога вялікага ахопу не было. І вельмі добра, што сёлета зрабілі такую акцыю, да якой далучылася вялікая колькасць людзей. Сярод надзённых спраў мы забываем, што сталым людзям патрэбна проста ўвага, магчымасць стасункаў. Падарункі, зразумела, радуюць, але часам не хапае звычайнай чалавечай спагады. Некаторыя так і кажуць: «Дзякуй, што прыйшлі. Падарылі магчымасць пагаварыць». Ім важна расказаць пра сваё жыццё, падзяліцца вопытам.

Для маладых такія аповеды карысныя. Без узаемадзеяння са старэйшым пакаленнем нельга выхаваць здаровую нацыю, без набыткаў мінулых гадоў чалавек наўрад ці стане патрыётам сваёй краіны, лічыць прадстаўнік БРСМ. Вось чаму маладыя валанцёры з вялікім натхненнем уключыліся ў акцыю «Ад усёй душы». Яны наведалі звыш ста чалавек на Гродзеншчыне. Мяркуецца, што акцыя не будзе разавай, бо клопату шмат не бывае. Асабліва ў адносінах да пажылых людзей. Некаторыя саромеюцца лішні раз нагадаць пра сябе, але шчырая ўвага пакідае ў іх душы добры водгук.

Нагадаем, што арганізатарамі дабрачыннай акцыі «Ад усёй душы» выступілі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства адукацыі, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638 |
| **Продавец** | ООО «Научно-инжиниринговый центр «ЭнергоТех», г. Минск, пер. С. Ковалевской, д. 62, УНП 192330729 |
| **Ликвидатор** | ООО «Эксперты», г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 227. УНП 191161046 (+375 296396255) |

**Предмет аукциона** (одним лотом)

**Оборудование:** оборудование для изготовления крупногабарит. деталей мет. фрезерной обработки с ЧПУ (комплект) (инв. № 506), станок вертикальный токар. с ЧПУ HW-1100 PR (комплект) (инв. № 502), система тепло-водо-воздухоснабжения производственно-технич. комплекса (инв. № 511), система электроснабжения производственно-технич. комплекса (инв. № 510), макетный образец энергосберег. установки (инв. № 505), счетчики электрич. энергии перемен. тока статический СС-301-5.1/U/P(L)K, 2 шт. (инв. № 508, 509), комплекс универсального оборудования сборочного стенда (инв. № 504), внутренний блок. AFI-180HPDC3C, 2 шт. (инв. № 512, 513), наружные (внешний) блоки AFI-180HPDC3C, 2 шт. (инв. № 516, 515); **и инвентарь в количестве 48 единиц** (подробный перечень на сайте организатора аукциона).
Местоположение – **г. Минск, пер. С. Ковалевской, 62**

**Начальная цена лота (с НДС 20 %) – 2 692 473,48 бел. руб.** (снижена на 10 %)
Шаг аукциона – **134 623,67 бел. руб.**

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона** проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию, тел. +375 29 639-62-55, Андрей Владимирович

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публич. торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидир. юридич. лица».
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты предмета аукциона:** не позднее **10 (десяти) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи**

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 26.11.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **26.01.2023 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Дата, время начала и окончания приема заявлений** | **С 09.00 12.01.2023 до 17.00 25.01.2023** по тому же адресу |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**



**Антикризисный управляющий общества с ограниченной ответственностью «МЯСОКОМБИНАТ ГЕОРГИЕВСКИЙ» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) извещает о проведении 14.02.2023 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221 открытых торгов по продаже дебиторской задолженности общества с ограниченной ответственностью «МЯСОКОМБИНАТ ГЕОРГИЕВСКИЙ»:**

ИП Александрова Т. В. (размер задолженности – 1 236,57 BYN) – начальная цена – 1 236,57 BYN; частное торговое унитарное предприятие «АйзенБерг» (размер задолженности – 492,85 BYN) – начальная цена – 492,85 BYN; ООО «Бухгалтер Бай» (размер задолженности – 261,30 BYN) – начальная цена – 261,30 BYN; ООО «ВалесТорг» (размер задолженности – 749,16 BYN) – начальная цена – 749,16 BYN; ООО «ВекОдин» (размер задолженности – 126,16 BYN) – начальная цена – 126,16 BYN; ООО «КофеФуд» (размер задолженности –13 122,94 BYN) – начальная цена – 13 122,94 BYN; частное торговое унитарное предприятие «Мейтаке» (размер задолженности – 3 447,81 BYN) – начальная цена – 3 447,81 BYN; ООО «Мишель Стар» (размер задолженности – 399,30 BYN) – начальная цена – 399,30 BYN; ООО «Нью-Бренд» (размер задолженности – 859,66 BYN) – начальная цена – 859,66 BYN; ООО «ТПК ФормаксТорг» (размер задолженности – 467,86 BYN) – начальная цена – 467,86 BYN; ООО «Торнадо-Групп» (размер задолженности – 55 949,40 BYN) – начальная цена – 55 949,40 BYN; ООО «Илона-Мит» (размер задолженности – 15 679,01 BYN) – начальная цена – 15 679,01 BYN; ИП Иванов А. А. (размер задолженности – 6 954, 35 BYN) – начальная цена – 6 954, 35 BYN; ИП Мурашко О. В. (размер задолженности – 28 884,77 BYN) – начальная цена – 28 884,77 BYN.

Ознакомиться с документами можно по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5/221, предварительно согласовав с представителем управляющего по тел. 8 029 130 85 30.

*Условия приема заявлений и прилагаемых к ним документов:* прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 13.02.2023.

*Сумма шага аукциона:* шаг аукциона (5 % от цены лота).

*Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактные телефоны:* антикризисный управляющий ООО «МЯСОКОМБИНАТ ГЕОРГИЕВСКИЙ» – ООО «Капитал Диалог», г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 221, 2-й этаж, тел. 8 029 130 85 30.

*Место нахождения предмета торгов:* г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 221.

*Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, необходимые реквизиты текущего (расчетного) банковского счета продавца, на который должна быть перечислена сумма задатка:* задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 13.02.2023 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 13.02.2023 г. на р/с ООО «МЯСОКОМБИНАТ ГЕОРГИЕВСКИЙ» р/с 3012 2163 1201 7027 0000 в ЗАО «Альфа-Банк», код ALFABY2X, УНП 101337728.

Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее чем за один день до их проведения. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах оформляются итоговым протоколом в день их проведения. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Участникам, не признанными победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Як праверыць насенне на ўсходжасць

**Сцвярджаем з упэўненасцю: 100-працэнтнай ўсходжасці насення не бывае. Нават лабараторная ўсходжасць складае каля 95—99 працэнтаў. Дома або ў цяпліцы дабіцца аптымальнага мікраклімату немагчыма, таму тут працэнт будзе зусім іншым. Гэта так званая аранжарэйная ўсходжасць, якая заўсёды ніжэйшая за лабараторную. Яе мы і можам праверыць у хатніх умовах. Але існуе яшчэ і палявая ўсходжасць насення. Яна замяраецца ў рэальных умовах адкрытага грунту. І гэты паказчык, як правіла, яшчэ ніжэйшы. Так што праверка насення на ўсходжасць дазволіць зразумець, ці хопіць пасяўнога матэрыялу на запланаваныя пасадкі.**

Зразумела, каштоўнае і дарагое насенне даводзіцца высаджваць без якіх-небудзь праверак. І з дзясятка семак у пакуначку на спробу таксама адабраць няма чаго. У гэтых выпадках спадзяёмся на праверанага вытворцу і заяўлены тэрмін прыдатнасці. І на ўсякі выпадак высейваем такое насенне на расаду крыху раней. Калі гэта падвядзе, застанецца час на пасеў іншага.

Але ў некаторых сітуацыях лепш перастрахавацца і праверыць пасяўныя ўласцівасці насення загадзя.

У кожнага агародніка ёсць рэшткі насення з мінулых гадоў. Выкідваць шкада, у пачатку сезона спадзяешся, што нарэшце высадзіш усё. Але калекцыя рэштак памнажаецца з кожным годам.



Вядома, у некаторых культур тэрмін прыдатнасці насення вялікі. Напрыклад, агуркі, гарбуз, кабачкі або кавуны могуць праляжаць восем гадоў. Капуста захоўвае ўсходжасць шэсць гадоў. Памідоры і баклажаны — пяць гадоў. А вось насенне цыбулі, пятрушкі або сельдэрэю нават год без страты якасці не вытрымае. Тым не менш, якім бы доўгім ні быў тэрмін захоўвання, агульнае правіла такое: чым даўжэй насенне захоўваецца, тым горш узыходзіць, таму старым без папярэдняй праверкі на ўсходжасць лепш не сеяць.

Сваё насенне мы звычайна збіраем з вялікім запасам. Пры такіх колькасцях ёсць магчымасць адабраць для сяўбы самае-самае.

Насеннем падзяліліся суседзі, сваякі, знаёмыя фермеры і да т. п. У гэтым выпадку вельмі пажадана не толькі праверка пасяўных уласцівасцяў, але і папярэдняя дэзынфекцыя. Проста таму, што пра гэта насенне нам нічога невядома. Калі колькасць дазваляе, лепш перад пасевам ацаніць яго ўсходжасць.

Насенне куплялася па акцыі. Цалкам верагодна, што прадавец знізіў цану з-за заканчэння тэрміну прыдатнасці або парушэння ўмоў захоўвання. Варта загадзя пераканацца, што «распродажнае» насенне не падвядзе.

Каліброўка — гэта свайго кшталту падрыхтоўчая працэдура, якая дапамагае адразу адсеяць відавочна непрыдатныя экзэмпляры. Калі насення больш чым дастаткова, спачатку праводзяць сартаванне па вонкавым выглядзе. Выдаляюць дробныя, пашкоджаныя, кволыя. Нават калі з іх нешта вырасце, годнага ўраджаю ўсё роўна не атрымаеш.

Пасля візуальнага адбору вельмі часта раяць адбракаваць «пустышкі», апусціўшы насенне ў ваду ці ў раствор паваранай солі. І ўсё ж у «водных працэдур» ёсць некалькі сур'ёзных недахопаў. Па-першае, калі насенне пакупное, абавязкова прачытайце ўсю інфармацыю на пакуначку. Яно можа быць апрацавана фунгіцыдам або стымулятарам росту. Пасля «купання» ўсе гэтыя рэчывы з паверхні насення змыюцца. Па-другое, у сучасных сартоў і гібрыдаў насенне мяккае само па сабе. Многае не тоне ў вадзе не таму, што яно нежыццяздольнае, а таму, што такая яго структура.

Ёсць яшчэ адзін момант. Каб праявілічыць тэрміны прыдатнасці, практычна ўсе вытворцы (як нашы, так і замежныя) высушваюць насенне да вельмі нізкай вільготнасці. Сухое будзе плаваць на паверхні вады — і ўсходжае, і няўсходжае.

*Працяг матэрыялу*
*у наступным выпуску «Крынічкі».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.23 | 17.13 | 7.50 |
| Віцебск — | 9.19 | 16.56 | 7.37 |
| Магілёў — | 9.13 | 17.03 | 7.50 |
| Гомель — | 9.02 | 17.07 | 8.05 |
| Гродна — | 9.37 | 17.30 | 7.53 |
| Брэст — | 9.30 | 17.38 | 8.08 |

## Месяц

*Поўня 7 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

*Пр.* Давыда, Іосіфа, Макара, Марыі, Якава.
*К.* Аркадзя, Тацяны.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 12 СТУДЗЕНЯ

У краіне

**858** год — з'явіліся першыя летапісныя звесткі аб племянным саюзе крывічоў, групе ўсходніх славян, якія займалі тэрыторыю верхняга цячэння Дняпра, Заходняй Дзвіны, Волгі, паўднёвай часткі басейна Чудскага возера. Па меркаванні некаторых навукоўцаў, назва «крывічы» азначае «блізкія па паходжанні» («па крыві»), іншыя даследчыкі спасылаюцца на імя родапачынальніка Крыва ці паганскага першасвятара Крыва-Крывейта.

**1895** год — адкрылася першая электрастанцыя ў Мінску, найбуйнейшая ў Беларусі з ліку муніцыпальных. Знаходзілася на правым беразе Свіслачы, побач з сучасным будынкам Дзяржаўнага цырка. Гэта дазволіла ўстанавіць 390 лямпачак напальвання: 140 для асвятлення вуліц, 140 у зімовым і летнім тэатрах і 110 у прыватных спажыўцоў.

**1914** год — у Мінску пачаў выдавацца краязнаўчы часопіс «Лучынка» (выходзіў да канца 1914-га).

**1919** год — нарадзіўся (в. Канічы Касцюковіцкага раёна) Васіль Фёдаравіч Хомчанка, беларускі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў і гумарэсак, кніг «Чырвоны мак» і «Чырвоныя хвалі», рамана «Вяртанне ў агонь» і іншых. Напісаў сцэнарыі да фільмаў «Ветразі майго дзяцінства», «Незнаёмая песня».



**1940** год — у Мінску адзначана самая нізкая за гады назіранняў мінусавая тэмпература паветра — 39,1 градуса марозу.

У свеце

**1628** — нарадзіўся Шарль Перо, французскі пісьменнік, крытык, аўтар вядомых казак «Кот у ботах», «Папялушка», «Сіняя барада».

**1903** год — нарадзіўся Ігар Васільевіч Курчатаў, савецкі фізік, арганізатар і кіраўнік работ па атамнай навуцы і тэхніцы ў СССР, акадэмік АН СССР, тройчы Герой Сацыялістычнай Працы.

**1919** год — задушана Паўстанне спартакістаў — усеагульная забастоўка і ўзброеная барацьба ў Берліне з 5 да 12 студзеня 1919 года. Гэта быў адзін з ключавых этапаў Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі. У ходзе паўстання Камуністычная партыя Германіі і левае крыло Незалежнай сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (НСДПГ), якія настойвалі на ўстанаўленні савецкай рэспублікі, супрацьстаялі ўраду, сфарміраванаму Сацыял-дэмакратычнай партыяй Германіі, і атрадам фрайкораў, якія складаліся з добраахвотнікаў, што раней служылі ў кайзераўскай арміі.

**1945** год — пачалася Вісла-Одэрская стратэгічная наступальная аперацыя савецкіх войск, для правядзення якой прыцягваліся 1-ы Беларускі (камандуючы — маршал Г. К. Жукаў) і 1-ы Украінскі (камандуючы — маршал І. С. Конеў) франты. Завяршылася 3 лютага 1945 года. Адначасова войскі 4-га (камандуючы — генерал арміі І. Я. Пятроў) і 2-га Украінскіх франтоў (камандуючы — маршал Р. Я. Маліноўскі) і 1-га Чэхаславацкага корпуса пачалі Заходне-Карпацкую стратэгічную наступальную аперацыю, якая завяршылася 18 лютага вызваленнем паўднёвых раёнаў Польшчы і значнай часткі тэрыторыі Чэхаславакіі.

**1998** год — на еўрапейскай канферэнцыі нацыянальных камітэтаў па біяэтыцы ў Парыжы быў адкрыты да падпісання Пратакол аб забароне кланіравання чалавека — першы міжнародны юрыдычны дакумент, які забараняе кланіраванне чалавека.

Так гаварыў...

**ВАСІЛЬ БЫКАЎ:**

*«Кожны чалавек — ад прыроды чалавек. Жыццё робіць з яго генія або злыдня».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Па дарозе дадому так прагна «пажыраў» вачыма дзяўчат, што калі прыйшоў, зразумеў, што на жонку нават глядзець не магу, — наеўся, відаць.**

Мне няшмат не трэба.

**Бываюць моманты ў жыцці, калі чыстыя шкарпэткі — гэта чорнае золата.**

Мезенец на назе — гэта прылада для знаходжання мэблі ў цёмным пакоі.

**— Адкуль у вас столькі вады ў дыпломнай рабоце?**
**— Я выкарыстаў некалькі крыніц.**

— Вы ведаеце, у мяне да вас змешаныя пачуцці.
— Магу параіць сепаратар.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12.768. Індэкс 63850. Зак. № 56.

Нумар падпісаны ў 19.30 11 студзеня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12